Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№220 (28584)
15 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 9–16



**Сумны лёс закінутых дамоў**

МС



**Чаму ў пад'ездах «залатыя» лямпы?**

СТАР. 3



**Несалодкае жыццё з дыябетам**

СТАР. 5

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$6,7 млрд**

*уклалі замежныя інвестары за студзень — верасень 2017 года ў рэальны сектар эканомікі Беларусі (акрамя банкаў), паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Асноўнымі інвестарамі арганізацый краіны былі суб'екты гаспадарання Расіі (40,6% ад усіх інвестыцый), Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі (26,6%), Кіпра (7,1%). За студзень — верасень 2017 года арганізацыямі краіны (акрамя банкаў) накіравана за мяжу інвестыцый на суму $4 млрд. Значныя аб'ёмы інвестыцый арганізацыямі краіны былі накіраваны суб'ектам гаспадарання Расіі (66,8% ад усіх накіраваных інвестыцый), Украіны (17,9%).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9976 | ▲ |
| Еўра | 2,3343 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0335 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0753 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
17220
9 771990 763008

■ Аты-баты

# ВОСЕНЬ КОЛЕРУ ХАКІ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Падчас адпраўкі ў войска ў Мінскім гарадскім ваенным камісарыяце карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся з сённяшнімі прызыўнікамі**

**Чарговая восень — і традыцыйна маладыя хлопцы ідуць абараняць Айчыну. Настрой, як правіла, бадзёры: адзінае, што, як кажуць, падлівае масла ў агонь, — гэта матчыны заплаканыя вочы. Ад таго, што некаторы час не ўбачацца са сваім, часам адзіным, дзіцем. І нават ад разумення, што нарэшце сын стане сапраўдным мужчынам.**

Адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і вайсковыя фарміраванні Беларусі працягнецца да канца месяца. Учора для праходжання тэрміновай воінскай службы было накіравана каля 1200 грамадзян нашай краіны, якія папоўнілі шэрагі сіл спецыяльных аперацый, Мінскай ваеннай камендатуры, кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл, а таксама навучальных вайсковых часцей.

Мінчанін Аляксей Масько падчас службы ў войску не толькі не адпачне ад сваёй асноўнай прафесійнай дзейнасці, а нават удасканаліць яе — не кожнаму музыку, хоць і часова, выпадае гонар служыць ва Узорна-паказальным аркестры Узброеных Сіл. Выпускнік Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава нават уявіць не мог, што калі-небудзь трапіць у праслаўлены калектыў. Такі шанц, як ні дзіўна, дала менавіта армія.

— Ён ідзе ў надзейныя рукі да айцоў-камандзіраў, якія добра ведаюць, што трэба салдату, — кажа бацька прызыўніка, афіцэр запасу Сяргей Масько, і тут жа жартуе: — У нас шырыні рэменя не хапіла, я думаю, што армейскі «рэмень» хутчэй прывучыць да дысцыпліны. Хвалявацца няма падстаў. Калі спатрэбіцца, то і я гатовы ў любую хвіліну стаць на абарону нашых межаў.

Вячаслава Пратасевіча ў войска выпраўляюць цэлым сямействам: апошнія парады даюць бацька, маці і бабуля. Хлопец, як і яго дзядуля, будзе служыць у войсках сувязі.

СТАР. 3

■ Зялёная эканоміка

## Адходы расплавяць і зробяць плітку

**У Навагрудку бяруцца за новы праект па перапрацоўцы другаснай сыравіны**

**Першым этапам стала ўстаноўка станцыі сарціроўкі адходаў, якая пачала дзейнічаць летась. Праект здзейснены ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва і фінансуецца ЕС (90%) і мясцовым бюджэтам (10%).**



Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

На выдаткаваныя сродкі пабудаваны цэх, дзе ўстаноўлена лінія сарціроўкі, склад, набыты два сучасныя смеццявозы, аўтапагрузчык, прэс, 200 кантэйнераў для смецця. Гэта дазволіла атрымаць у год каля трох тысяч тон другаснай сыравіны.

Магчыма, у маштабах краіны гэта невялікая лічба. Але ў раёне новы аб'ект прыносіць адчувальны эфект. Па-першае, значна зменшыўся паток адходаў на палігонах, а яны, як вядома, паўсюдна перагружаны. Па-другое, другасная сыравіна паступае на перапрацоўку, а гэта хоць і невялікі, але прыбытак. Для камунальнікаў важна, што гэта работа ўжо пачалася.

— У 2010 годзе нам перадалі 43 мініпалігоны, сёння засталося 10, — адзначае **дырэктар Навагрудскай ЖКГ Мікалай БАРАНОЎСКІ.** — Цяпер мы можам амаль тры тысячы тон адходаў накіраваць на перапрацоўку, і дзве тысячы тон спрасаваць. Раздзельным зборам ахапілі ўсе аграгарадкі, у райцэнтры стварылі 56 пляцовак.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!
Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ВЫБАРЫ — ДАСТУПНЫЯ І ПА ЗАКОНЕ

## Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Цэнтрвыбаркама

**Тэма — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў 28-га склікання, якія пройдуць ужо праз тры месяцы, у сярэдзіне лютага. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы падчас размовы з Лідзіяй Ярмошынай, старшынёй Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, галоўнае ў будучай выбарчай кампаніі — зэканоміць сродкі, але ні ў якім разе не пакрыўдзіць людзей, якія будуць працаваць на гэту кампанію.**

— Галоўнае для мяне — вызначыцца з датай, фінансаваннем і праектам указа, які павінен быць падпісаны, — адзначыў кіраўнік краіны. — Па Канстытуцыі рашэнне аб выбарах у мясцовыя Саветы прымае Прэзідэнт. Мы, відаць, з вамі, з Цэнтральнай камісіяй, тут сыходзімся — прыкідвалі па тэрмінах: думаю, што сярэдзіна лютага, можа нават і 18-га, як мы гэта абмяркоўвалі, — будзе, відаць, нармальна.

Нагадаем, выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў павінны прайсці не пазней чым за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў цяперашніх Саветаў.

— Нармальны час: усё-такі люты — найбольш спакойны месяц, — лічыць Прэзідэнт. — Не ўборка, не пасяўная і аўралаў ніякіх. Год скончаны — пачынаецца новы. І фінансавы, і эканамічны. Таму якраз дарэчы гэтыя выбары. І вынікі будуць відаць, будзе што казаць кандыдатам у дэпутаты.

Што да фінансавання, то тут важна, як адзначыў Прэзідэнт, правесці вельмі «танныя» выбары — у фінансавых адносінах:

— Думаю, мы яшчэ сустрэнемся з вамі і з губернатарамі. Адміністрацыі Прэзідэнта я даручыў, каб яна была з вамі побач, каб можна было на месцы здзейсніць арганізацыйныя меры: падрыхтаваць участкі і гэтак далей. Усё-такі гэта палітычная кампанія, і Адміністрацыя павінна зрабіць сваю работу. Ну а Цэнтрвыбаркам павінен арганізаваць выбары па законе: бюлетэні, семінары, навучанне на месцы кіраўнікоў участковых камісій.

Зэканоміць можна на ўчастках для правядзення галасавання — месцы, дзе гэта будзе адбывацца, павінны прывесці ў парадак арганізацыі, якім належаць памяшканні.

— Мы пастараемся гэта зрабіць за кошт таго, што ў нас у прынцыпе ўсё гатова з тых выбараў, каб ні урны не выкідалі, ні кабінкі, усё гэта ёсць на месцы, — сказаў Прэзідэнт. — Ну а галоўнае — гэта зарплата тых людзей, якія будуць задзейнічаны на гэтых выбарах. Шчыра вам кажу: хоць грошы ёсць — яны ў праекце бюджэту закладзены, лепш зэканоміць, але не за кошт тых людзей, якія будуць працаваць.

Асобная просьба Аляксандра Лукашэнкі да старшыні ЦВК датычылася таго, каб зразумела растлумачыць людзям сутнасць будучай кампаніі:

— Важна, каб вы ўсе нюансы абазначылі загадзя, каб не было гадання на кафейнай гушчы і розных інсінуацый. Каб мы ад улады сказалі выразна і пэўна: вось выбары, вось прынцыпы. Хаваць нічога не будзем. Хто гатовы на выбары ісці, няхай ідзе — па законе. Улада стварыць усе ўмовы для таго, каб выбары былі даступныя. А вас я папрашу пракантраляваць, каб гэта было сапраўды даступна. Усе ўзроўні ўлады будуць працаваць у тым кірунку, які абазначыць Цэнтрвыбаркам, як гэта было і заўсёды.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

#### ЯКАСЦЬ КАМПАНІІ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КАНДЫДАТАЎ

**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў**, пасля сустрэчы з Прэзідэнтам адказала на пытанні журналістаў.

**...Пра бюджэт выбараў**

«Ён складае практычна тую ж самую суму, якая была выдаткавана ў 2014 годзе, — у валютным эквіваленце гэта каля $10,5 млн. Калі гаварыць у беларускай валюце, гэта дзесьці BYN21,2 млн», — паведаміла Лідзія Ярмошына.

**...Пра назіральнікаў**

У нашай краіны няма міжнародных абавязацельстваў запрашаць на выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў міжнародных назіральнікаў. «Тым не менш кіраўнік дзяржавы падкрэсліў асаблівую ролю назірання і сказаў, што, натуральна, з'яўляецца разумнай і неабходнай наша звычайная практыка даваць гэтыя прэферэнцыі для вядзення кароткатэрміновага назірання ўсім замежным дыпламатам, якія акрэдытаваны ў Рэспубліцы Беларусь», — паведаміла Лідзія Ярмошына.

«Асноўны ўпор, вядома, будзе рабіцца на нацыянальнае назіранне. Яно заўсёды з'яўляецца вельмі шматлікім. Думаю, што палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні і гэты раз не падвядуць нас і праявяць дастатковую актыўнасць для арганізацыі назірання», — адзначыла старшыня Цэнтральнай камісіі.

**...Пра чаканую яўку**

Падчас мінулых выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, якія праходзілі ў 2014 годзе, яўка выбаршчыкаў склала каля 78%. А ўвогуле, лічыць старшыня Цэнтрвыбаркама, усё залежыць ад кандыдатаў у дэпутаты.

Калі гаварыць пра іншыя асаблівасці будучай кампаніі, то Лідзія Ярмошына чакае, што яна будзе дастаткова спакойная: «Я заўважыла, што чым больш грошай укладваецца ў фінансаванне асобных кандыдатаў, тым бруднейшая выбарчая кампанія. Не думаю, што кандыдаты ў дэпутаты на выбары ў мясцовыя Саветы будуць укладваць альбо атрымліваць досыць вялікія сродкі на вядзенне перадвыбарнай агітацыі. Таму я думаю, што ў нас выбарчая кампанія будзе ў гэтым плане дастаткова стэрыльная».

# ДЫНАМІКА Ў КАНКРЭТЫЦЫ

## Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з паслом Грузіі ў Беларусі

**За апошнія гады нашы адносіны з гэтай краінай істотна палепшыліся, тавараабарот паказвае станоўчыя тэндэнцыі, ды і ў гуманітарных сферах мы збліжаемся. Прынамсі, гэтым летам для нашых суайчыннікаў Грузія была адным з самых жаданых курортаў. Падставай для ўчарашняга дыялогу Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Грузіі ў Рэспубліцы Беларусь Давіда Катарыі стала завяршэнне дыпламатычнай місіі апошняга. Але абмяркоўваліся не толькі дасягненні, але і перспектывы супрацоўніцтва.**

— Асноўная актыўнасць нашых адносін з Грузіяй за 25 гадоў незалежнага супрацоўніцтва прыйшлася менавіта на перыяд, калі вы сталі паслом у Беларусі, — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Увогуле ж для супрацоўніцтва дзвюх краін — вельмі добрыя перспектывы, упэўнены беларускі лідар. Ён адзначыў, што ўдзячны грузінскаму калегу за запрашэнне наведаць Грузію:

— Мы дамовіліся, каб візіт быў яркі і карысны, нам трэба напоўніць яго канкрэтным зместам. Каб пасля сустрэч — прэзідэнтаў, урадаў — у нас была дынаміка ў канкрэтыцы. Каб народы Грузіі, Беларусі не сказалі, што мы цырыманіяльна сустракаемся. Хоць я з вялікім нецярпеннем чакаю сваёй чарговай паездкі ў Тбілісі, у Грузію.

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што ў Грузіі яму асабліва цікава будзе паглядзець горы, прыроду. Ён выказаў меркаванне, што недзе ў першай палове наступнага года візіт здзейсніцца.

— Вас папрашу далёка не адыходзіць, бо вы ў тэме, — дадаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да дыпламата. — Вы зможаце і нам, і грузінскаму боку аказаць сур'ёзную падтрымку падчас гэтага візіту.

За апошнія гады тавараабарот павялічыўся ў разы, а гэта фундамент добрых адносін паміж любымі краінамі. Раней Беларусь і Грузія практычна не мелі тавараабароту... У мінулым годзе ён склаў больш за 73 мільёны долараў (гэта 163% да ўзроўню 2015-га), а ўжо сёлета за студзень — верасень мы нагандлявалі больш чым на 72 мільёны долараў. Тэндэнцыя станоўчая. Ды і дасягненняў нямала.

— Пачынаючы ад пасадкі бульбы ў Прэзідэнта Грузіі, майго сябра, — прывёў прыклад Аляксандр Лукашэнка.

Нагадаем, прыкладна месяц таму кіраўнік Грузіі ў сваім акаўнце ў Фэйсбуку выклаў фота ўраджаю бульбы, якая вырасла на яго падворку з беларускага насення, — падоранага, дарэчы, Аляксандрам Лукашэнкам.

### У тэму

**Давід КАТАРЫЯ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі:**

— На працягу апошніх гадоў грузінска-беларускія адносіны дынамічна развіваюцца на ўсіх узроўнях. Візіт беларускага лідара ў Грузію даў магутны штуршок для развіцця палітычных, гандлёва-эканамічных, культурных сфер. Днямі, дарэчы, пачнуцца Дні культуры Беларусі ў Грузіі. Перспектыўнымі сферамі для развіцця адносін бачацца такія, як сельская гаспадарка, прамысловасць, будаўніцтва, тэхналогіі — у тым ліку IT, будаўніцтва інфраструктуры, турызм.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Кангрэсмены ЗША абмежавалі памер пенсіі экс-прэзідэнтам да $200 тысяч у год



Рэспубліканец Джодзі Хайс паведаміў, што ў бягучым фінансавым годзе пяць экс-прэзідэнтаў краіны, якія жывуць на сённяшні дзень, абышліся бюджэту ў $2,84 млн.

Члены Палаты прадстаўнікоў ЗША прынялі законапраект, які абмяжоўвае памер пенсій былым прэзідэнтам краіны да $200 тысяч у год. Цяпер дзяржаўная пенсія ім налічваецца ў памеры $205 тысяч у год. Законапраект прадугледжвае таксама памяншэнне да $500 тысяч у год сумы, якая выдзяляецца кожнаму з іх на арэнду офіса і аплату працы штата памочнікаў.

Практычна ўсе дэпутаты кангрэса, хто выступаў, падкрэслівалі, што экс-прэзідэнты зарабляюць на чытанні лекцый і выданні сваіх мемуараў мільёны долараў, не маюць патрэбы ў фінансавай дапамозе з боку дзяржавы.

Як адзначыў ініцыятар законапраекта рэспубліканец Джодзі Хайс, «цяпер няма неабходнасці выкарыстоўваць грошы падаткаплацельшчыкаў для падтрымкі былых прэзідэнтаў у адрозненне ад сітуацыі, якая мела месца ў 1958 годзе, калі толькі прымаўся адпаведны закон».

У кастрычніку аналагічны законапраект быў ухвалены сенацкім камітэтам па нацыянальнай бяспецы. На разгляд калег яго прадставіла сенатар Джоні Эрнст. «Дзярждоўг краіны перавышае $20 трлн, і прапанаваныя намі меры — яшчэ адзін важны крок, закліканы спыніць бескантрольнае расходаванне казённых сродкаў», — адзначыла яна тады.

## Вялікабрытанія не хоча вяртацца да халоднай вайны з Расіяй

Пра гэта заявіла брытанскі прэм'ер-міністр Тэрэза Мэй, якая выступіла з прамовай на банкеце лорда-мэра лонданскага Сіці.

«Мы не хочам вяртацца да халоднай вайны або знаходзіцца ў стане вечнага супрацьстаяння», — сказала яна. «І ў той час як мы павінны быць пільныя, мы хочам узаемадзейнічаць, і менавіта таму ў найбліжэйшыя месяцы міністр замежных спраў Барыс Джонсан наведае Маскву», — дадала прэм'ер.

«Шмат хто з нас глядзеў на постсавецкую Расію з надзеяй. Таму што мы ведаем, што моцная і квітнеючая Расія будзе адпавядаць інтарэсам Вялікабрытаніі, Еўропы і свету, — сказала Тэрэза Мэй. — У якасці пастаяннага члена СБ ААН Расія мае магчымасці для таго, каб выконваць жыццёва важную ролю ва ўмацаванні міжнароднай стабільнасці, і яна адказная за гэта», — адзначыла Мэй.

У той жа час яна папярэдзіла, што, пакуль гэтага не адбудзецца, «мы будзем дзейнічаць разам для таго, каб абараняць нашы інтарэсы і міжнародны парадак, ад якога яны залежаць».

Кіраўнік брытанскага ўрада назвала Расію галоўнай краінай, якая спрабуе падарваць міжнародную сістэму правілаў.

## Пасол ЕС: перспектыў членства Украіны ў Еўрасаюзе на гэты момант няма

Еўрасаюз не гатовы прапанаваць Украіне перспектыву членства ў сваім аб'яднанні. Пра гэта заявіў кіраўнік прадстаўніцтва ЕС ва Украіне Юг Мінгарэлі.

«Цяпер у ЕС няма магчымасці прапанаваць перспектыву ніводнай краіне-партнёру. Магчыма, праз некалькі гадоў гэта адбудзецца, але цяпер — не», — прыводзіць выданне «Европейская правда» яго адказ на пытанне аб актуальнасці цяперашніх фарматаў супрацоўніцтва з усходнімі партнёрамі ЕС, у тым ліку з Украінай.

Мінгарэлі падкрэсліў, што краіны ведаюць пра негатыўнасць ЕС да дыскусіі аб перспектыве членства і ў сваёй палітыцы павінны зыходзіць з гэтага. «Такая рэальнасць», — растлумачыў ён.

**12 лістапада 2017 года заўчасна пайшоў з жыцця кандыдат тэхнічных навук, лаўрэат Прэміі Савета Міністраў СССР у галіне навукі і тэхнікі, намеснік генеральнага дырэктара Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання парашковай металургіі**

**Анатоль Леанідавіч РАК**

Анатоль Леанідавіч нарадзіўся 12 кастрычніка 1955 года ў Мінску. У 1982 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут.

З 1976 года А. Л. Рак працаваў у Інстытуце парашковай металургіі і прайшоў працоўны шлях ад старшага лабаранта, загадчыка сектара СКТБ, загадчыка аддзялення, галоўнага інжынера — намесніка дырэктара інстытута да намесніка генеральнага дырэктара ДНВА парашковай металургіі.

Уся працоўная дзейнасць Анатоля Леанідавіча звязана з распрацоўкай тэхналогій і арганізацыяй вытворчасці порыстых парашковых матэрыялаў і вырабаў з іх на досведнай вытворчасці інстытута і на Маладзечанскім заводзе парашковай металургіі.

За сваю плённую працоўную дзейнасць А. Л. Рак быў узнагароджаны ў 2011 годзе медалём «За працоўныя заслугі».

**Калектыў ДНВА і Інстытута парашковай металургіі, сябры і калегі смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці А. Л. РАКА і выказваюць спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Дашко Анатолю Міхайлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

■ Энергазберажэнне

# ЦІ НАСТОЛЬКІ МЫ БАГАТЫЯ,

## каб марнаваць «залатыя» тоны ўмоўнага паліва

**Мудрагелістае слова «энергазберажэнне» — гэта фактычна паляпшэнне эрганамічных характарыстык жыцця насельніцтва, да якога далучаецца само насельніцтва. А сферу жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўжо нельга разглядаць як асобна ўзяты дом — трэба мець на ўвазе цэлы горад і нават раён, якія, працуючы, як адна сістэма, змогуць зберагаць і рацыянальна расходаваць энергарэсурсы. Такія меркаванні гучалі падчас абмеркавання шляхоў павышэння энергаэфектыўнасці ў ЖКГ.**

### Заложнікі нядбайнасці. Цеплавой і светлавой

Існуючыя ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы праблемы, звязаныя з энергетыкай, часта ўзнікаюць праз чалавечую нядбайнасць, заўважыў **Уладзімір КАМАШКА, намеснік дырэктара дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі**. Аснашчэнне месцаў агульнага карыстання (у прыватнасці пад'ездаў) аўтаматызаваным кіраваннем сістэмай асвятлення ён ахарактарызаваў як далёка не самае лепшае.

Нагадаем, што да 2012 года ва ўсіх месцах агульнага карыстання павінны былі ўладкаваць гэтую сістэму, і па справаздачах, здаецца, усё гэта выканана і працуе. Аднак насамрэч гэта далёка не так: каля 30% абсталявання проста не працуе, ёсць месцы, дзе яго ўвогуле няма. А частка аўтаматызаванай сістэмы асвятлення працуе няправільна: святло ўключаецца ўвечары аўтаматычна і гарыць да раніцы замест таго, каб уключацца, рэагуючы на гук ці рух, расказаў Уладзімір Камашка.

— Жыхары цяпер плацяць за асвятленне месцаў агульнага карыстання, і фактычна яны становяцца заложнікамі нядбайнасці чалавечага фактару на месцах і вымушаны плаціць за тое, за што плаціць не варта ўвогуле. Сёлета Галоўдзяржбудэкспертызе даручана вяртаць праекты, дзе не прадугледжана кіраванне асвятленнем, як негатовыя, і не праводзіць экспертызу, — падкрэсліў ён. — Такая ж сітуацыя і з ацяпленнем месцаў агульнага карыстання, якія не трэба падаграваць, калі тэмпература на дварэ ад +4 °С і вышэй, але ж гэта робяць. Прычым згаданая праблема датычыцца нават не столькі сістэмы ЖКГ, колькі канкрэтных службовых асоб, якія павінны адсочваць гэтыя моманты і ўтрымліваць належным чынам.

Прадстаўнік дэпартамента па энергаэфектыўнасці абазначыў таксама праблему пераходу да мясцовых відаў паліва (МВП). У сістэме ЖКГ 3787 кацельняў, 2933 з іх працуюць на мясцовых відах паліва (МВП). У 2016—2020 гадах запланавана перавесці на МВП каля 130 кацельняў, рэалізуецца праект выкарыстання драўляных біямас у цэнтралізаваным цеплазабеспячэнні. «Разам з тым сабекошт вытворчасці цеплавой энергіі на дровах у розных раёнах і на розных кацельнях вар'іруецца ад 62,16 рубля да 238,05 рубля, а на дранцы — ад 42 да 148 рублёў», — заўважыў ён.



Пры існуючых недакладнасцях работы ў нашай краіне ёсць каласальнае дасягненне. Сёлета ў фінал Міжнароднага конкурсу навукова-адукацыйных праектаў «Энергія будучага», які праходзіць у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, і дзе ўдзельнічала 2296 праектаў з 112 краін свету, выйшаў праект Гомельскага аблвыканкама «Энергарандэву ў Беларусі — 2». Яго сутнасць у замене шыфернай страхі Гомельскага дзяржаўнага абласнога ліцэя чарапіцай з убудаванымі ў яе фотавальтаічнымі элементамі, расказаў Уладзімір Камашка.

### Як эканоміць дома

— Беларусь не валодае колькасцю энергарэсурсаў, здольных забяспечыць штодзённыя патрэбы сваіх жыхароў і работу прамысловасці. Большасць энерганосьбітаў імпартуецца з-за мяжы. І кожную тону ўмоўнага паліва трэба разглядаць на вагу золата, бо за ўсё гэта мы плацім валютай, — заўважыў **Ігар ТУР, начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў**.

З гэтай нагоды ён заклікаў да эфектыўнага і рацыянальнага выкарыстання набытага такім чынам золата ў выглядзе энергарэсурсаў. І прапанаваў задумацца, наколькі мы багатыя, каб дазволіць сабе выкідваць празмерна цёплае паветра праз фортку, губляць ваду з крана, які пастаянна цячэ, марнаваць энергію праз уключаны тэлевізар, які ніхто не глядзіць.

Як матываваць людзей больш эканоміць, расказаў **Дзмітрый БУРОНКІН, каардынатар энергетычнай праграмы ўстановы «Цэнтр экалагічных рашэнняў»**:

— У Браславе мы будзем кансультаваць насельніцтва такім чынам: на базе ЖКГ створым структурнае падраздзяленне па кіраванні энергетыкай. Кожны зможа туды прыйсці і вырашыць свае канкрэтныя праблемы. Калі ўсе мінчане знізяць энергаспажыванне хоць бы на 10%, то ў маштабах горада гэта будуць вялізныя лічбы. Для гэтага дастаткова замяніць усе лямпачкі ў кватэры энергазберагальнымі. А яшчэ правільна заклеіць вокны, адсунуць халадзільнік ад батарэі ці пліты.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

## У СІНГАПУРЫ ПРАЙШОЎ ІНВЕСТФОРУМ «BELARUS CALLING ASIA»

**Форум прысвечаны супрацоўніцтву краін азіяцкага рэгіёна з Беларуссю ў фінансава-інвестыцыйнай сферы**

**Форум быў арганізаваны пасольствам Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы пры садзейнічанні ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі, прадстаўніцтва ААТ «Белшына» ў Сінгапуры, пасольства Рэспублікі Беларусь у Інданезіі, паведамілі ў пасольстве нашай краіны ў КНР.**




У рамках форуму прайшлі прэзентацыі інвестыцыйнага клімату нашай краіны, індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Прагучалі выступленні першага намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Васіля Мацюшэўскага, старшага дзяржаўнага міністра міністэрства гандлю і прамысловасці, міністэрства нацыянальнага развіцця Сінгапура Коха Поха Куна і іншых. На палях форуму падпісаны пагадненні ў гандлёва-інвестыцыйнай сферы паміж беларускімі і азіяцкімі партнёрамі, у тым ліку на прысваенне Рэспубліцы Беларусь суверэннага рэйтынгу па кітайскай нацыянальнай шкале для размяшчэння каштоўных папер на фінансавым рынку КНР у юанях, па ўваходжанні новага рэзідэнта ў індустрыяльны парк «Вялікі камень», па развіцці кітайскай кампаніяй у Беларусі праекта «Каршэрынг — машыны для агульнага карыстання», на пастаўку буйных партый малочных прадуктаў і мяса птушкі з Беларусі ў Кітай, натуральнага каўчуку для вытворчасці шын з Сінгапура ў нашу краіну

■ Новыя кнігі

## ПРАЦЯГ «ЗАЛАТОЙ КАЛЕКЦЫІ...»

**У выдавецтве «Мастацкая літаратура» выходзіць адмысловая серыя кніг, якая паказвае ўсю рэтраспектыву развіцця беларускай літаратуры, — «Залатая калекцыя беларускай літаратуры ў 50 тамах».**




Пабачыў свет 15 том — «Паэзія першай паловы ХХ стагоддзя: міжваенны перыяд». У зборнік уключаны вершы тых паэтаў, якіх сёння не так і часта выдаюць: Андрэя Александровіча, Змітрака Астапенкі, Міхася Багуна, Зінаіды Бандарынай, Наталлі Вішнеўскай, Анатоля Вольнага, Цішкі Гартнага, Алеся Гурло, Сяргея Дарожнага, Алеся Дудара, Янкі Журбы, Тодара Кляшторнага, Макара Краўцова, Юркі Лявоннага, Валерыя Маракова, Леапольда Родзевіча, Казіміра Сваяка, Юліі Таўбіна, Валянціна Таўлая, Паўлюка Труса, Сяргея Фаміна, Уладзіміра Хадыкі, Міхася Чарота. Чытаем у выдавецкай анатацыі: "Творчасць аб'ядноўвае не толькі гістарычны перыяд, але таксама інтэлігентнасць і тонкі псіхалагізм у выяўленні пачуццяў. У кнігу ўвайшлі як хрэстаматыйныя, так і менш вядомыя творы, вартыя пільнай увагі аматараў паэтычнага слова». Укладальнік і аўтар каментарыяў паэтычнага тома «Залатой калекцыі...» — кандыдат філалагічных навук Алеся Шамякіна.

Многія вершы, якія ўвайшлі ў кнігу, прэтэндуюць на хрэстаматыйнасць. Як, напрыклад, вось гэтыя радкі Уладзіміра Хадыкі: «Не, не веру, брат, я, каб была прыгажэй / Па пякноце сваёй Швейцарыя!.. / Паглядзі толькі ты, прыглядзься бліжэй / Вокам ясным на сіні-абшары...» Напісаны ў 1926 годзе, гэты верш быў пэўны час «пад забаронай». Як і імя яго аўтара — вязня ГУЛАГа. Гартаеш старонкі сапраўды хрэстаматыйных — і міжволі згадваеш, што шмат хто з аўтараў патрапіў пад жорны сталінскіх рэпрэсій: Андрэй Александровіч, Анатоль Вольны, Цішка Гартны, Тодар Кляшторны, Валерый Маракоў, Уладзімір Хадыка, Міхась Чарот...

**Сяргей ШЫЧКО.** *shychko@zviazda.by*

# ВОСЕНЬ КОЛЕРУ ХАКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вельмі ганарыцца сваім прадзедам, які ваяваў у гады Вялікай Айчыннай вайны і дайшоў да Перамогі. Нягледзячы на тое, што ўсё жыццё Вячаслаў пражыў з бацькамі, апошнія не сумняваюцца ў яго самастойнасці. Аказваецца, літаральна перад войскам прызыўнік амаль тры месяцы пражыў у вёсцы — па яго словах, спрабаваў хоць нейкім чынам прызвычаіцца да таго, што год будзе не дома.

— У адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі гэтай восенню выкліку на прызыўныя камісіі падлягае каля 80 тысяч прызыўнікоў, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Алег ПАЗНЯК.** — Цяпер у ваенных камісарыятах завяршаецца работа па медыцынскім аглядзе грамадзян. Акрамя таго, прызыўнымі камісіямі на дадзены момант прынята больш як 55 тысяч рашэнняў.

Улічваючы патрэбу Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў у камплектаванні асабістым складам, да 30 лістапада ў армію плануецца накіраваць каля 11 тысяч чалавек. Акрамя таго, да 1,5 тысячы чалавек у гэты перыяд будзе адпраўлена для праходжання службы ў рэзерве.

Падчас гэтай прызыўной кампаніі дадзена звыш 26 тысяч адтэрміновак, большую частку якіх — 85% — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



Іншыя юнакі атрымалі адтэрміноўку па стане здароўя, сямейных абставінах, для набыцця ваенна-тэхнічных спецыяльнасцяў. 17 чалавек замест вайсковай службы будуць праходзіць альтэрнатыўную.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# Адходы расплавяць і зробяць плітку

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праўда, пакуль ёсць праблема з заключэннем дагавораў з сельскімі жыхарамі. Гэта тыповая сітуацыя, якую можна назіраць у кожным раёне. Але ў Навагрудку з насельніцтвам вядуць пастаянную работу, да кожнага даводзіцца інфармацыя, што гэта паслуга абавязковая. Заключаць дагаворы можна прымусіць і праз судовыя інстанцыі. У кожнай вёсцы ёсць такія прыклады, і гэты метад вельмі дзейсны, зазначае Мікалай Бараноўскі. Цяпер дагаворамі ахоплена 72% сельскіх жыхароў. Са свайго боку камунальнікі забяспечваюць своечасовы вываз смецця, наладжаны пункты збору другаснай сыравіны ў вёсках, павялічваецца тэхнічны парк. У лізінг сюды паступіць яшчэ адзін сучасны смеццявоз, які каштуе 200 тыс. рублёў. Пашыраецца зона збору адходаў. У хуткім часе ў яе ўвойдуць суседнія Карэліцкі і Дзятлаўскі раёны. Тут будуць устаноўлены кантэйнеры і прэсы.

— Гэта работа дае плён, — робіць вывад Мікалай Бараноўскі. — Калі летась мы здалі чатыры тоны шкла, то сёлета ўжо 212 тон. На перапрацоўку паступіла каля 20 тон пластыку, 54 тоны паперы. Раней усё гэта ішло на палігон.

Дарэчы, на самім палігоне таксама ідзе сарціроўка. Тут працуе брыгада ў асноўным з ліку абавязаных асобаў па 18-м дэкрэце. Яны выбіраюць другасную сыравіну, якая прайшла міма лініі сарціроўкі і трапіла на сметнік. Разлічваюцца з брыгадай у канцы дня і цякучкі кадраў на гэтым участку амаль няма. А ўсяго ў цэху сарціроўкі створана 15 новых працоўных месцаў.

У Навагрудку ставяць задачу павялічыць долю другаснай сыравіны з агульнага аб'ёма адходаў. Пакуль паказчык невысокі — усяго 7%. Гэта на паўтара працэнта менш, чым па Гродзенскай вобласці (па краіне — 10—11%). Камунальнікі падлічылі: каб павялічыць аб'ём паперы, сям'я павінна здаваць у месяц 15 кг. Гэта наўрад ці рэальна, лічыць Мікалай Бараноўскі. На яго думку, паперу больш рацыянальна не са сметнікаў збіраць, а працаваць з гандлёвымі і харчовымі прадпрыемствамі, дзе яна больш выкарыстоўваецца.

І ўсе ж на будучыню тут робяць стаўку на палімерныя адходы. Справа ў тым, што раён мае шанцы атрымаць грант у памеры 800 тыс. еўра для больш паглыбленай перапрацоўкі сыравіны. Плануецца ўстанавіць новую тэхналагічную лінію, дзе палімеры будуць плавіцца, змешвацца з пяском. Такім чынам тут атрымаюць новы від вырабаў — палімерна-пясчаную плітку. Магчыма, з гэтай сумесі будуць выпускацца каналізацыйныя люкі. Мяркуецца разгледзець яшчэ 20 відаў рознай прадукцыі.

Больш поўна будуць выкарыстоўвацца адходы, якія не падпадаюць пад перапрацоўку. Праектам прадугледжана іх кампаставанне з атрыманнем біягазу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в аг. Барсуки и аг. Будагово Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **14 декабря 2017 года в 10.00** г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот №1 –** земельный участок №17 площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881701101000435 в аг. Барсуки **Лот №2 –** земельный участок площадью 0,1433 га с кадастровым номером 624881703101000413 в аг. Будагово |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот №1** – 16 000,00 рублей **Лот №2** – 10 000,00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | **Лот №1, 2 (электроснабжение, газоснабжение)** |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ №616 в филиале 612 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Окончательный срок приема заявлений | **11 декабря 2017 года до 17.00** |
| 13 | Контактные телефоны | 8 01775 35-449, 8 01775 37-174, 8 01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: земельный участок в аг. Барсуки – 1 601,09 рубля, земельный участок в аг. Будагово – 1 646,70 рубля (без учета стоимости информационного сообщения).**

Примечание: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

**Извещение о проведении 18 декабря 2017 года торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней**

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества) | Изолированное помещение, с инв. № 500/D-7022429, общая площадь – 453,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 144, пом. 1 |
| Начальная цена | 1 014 125,59 бел. руб. |
| Сумма задатка | 100 000,00 бел. руб. |
| Организатор аукциона | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, (017) 327-05-62 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 18 декабря 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 17.11.2017 по 13.12.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОНОВ**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукционов** | Ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2 |
| **Продавец** | ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» 212008, г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2. Тел. 8 (0222) 72-77-72 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1. Объекты недвижимого имущества (составные части и принадлежности), расположенные по адресу:** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17, в составе:

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь |
|---|---|---|
| 700/С-3733 | **Здание цеха облицовочной плитки №2 с административными помещениями (доля – 8/15)** (Здание многофункциональное) | 5 948,6 кв. м |
| 350/С-100401 | **Здание административного корпуса (доля – 1/5)** (Здание административного корпуса) | 1291,0 кв. м |

**Составные части и принадлежности:** кабельные линии внутри здания; автомат повторного включения 1600а апв-5; кабельные линии связи; пожарная сигнализация офиса; приточно-вытяжная вентиляция; сигнализация; система видеонаблюдения; система электроснабжения;
счетчики электроэнергии – 8 шт., видеонаблюдение склада; кран мостовой двухбалочный г/п 3,2 т; складское оборудование; стеллаж 1; стеллаж; сторожевая будка; металлическое ограждение с воротами и калиткой; ограждение площадки для производств.; ограждение площадки-1; ограждение площадки-2; площадка, прилегающая к цеху; пропускной пост; система пожарной сигнализации цеха; сторожевая будка-2; таль; стеллаж

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Объекты недвижимого имущества расположены на двух земельных участках: участок (для содержания и обслуживания здания цеха) площадью 0,8615 га (доля 21/50, право постоянного пользования), участок (для содержания и обслуживания здания административного корпуса) площадью 0,0440 га (доля 1/5, право аренды по 20.12.2021) |
| **Сведения об обременениях** | **Арендаторы.** Подробная информация по телефону +375(44)729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович |
| **Начальная цена** с НДС 20% | **564 370 руб. 00 коп.** |
| **Шаг** аукциона | **28 218 руб. 50 коп.** |
| **Задаток** | **2 000 руб. 00 коп.** |

**Срок подписания договора купли-продажи**: не позднее 1 рабочего дня после проведения аукциона

**Срок оплаты**: в течение 3 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иной срок не определен договором купли-продажи

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» 07.10.2017, 19.10.2017, 31.10.2017

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **27 ноября 2017 г. в 11.00,** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, офис ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **24 ноября 2017 г. до 18.00,** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |

**Предмет аукциона (полный перечень позиций каждого лота на сайте www.skt-zpt.by)**

**Сантехнические изделия для систем отопления, водопровода и канализации, расположенные по адресу: г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена с НДС 20%, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. с НДС 20% | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Фитинги для металлопластиковых труб под пресс (**муфты пресс, тройники-пресс, угольники-пресс и др.**) Bonomi, Италия** | 32 422,82 | 1 621,14 | 1 621,14 |
| 2 | **Фитинги для металлопластиковых труб под ключ (**муфты-ключ, тройники-ключ, угольники-ключ и др.**) Bonomi, Италия** | 2 672,63 | 133,63 | 133,63 |
| 3 | Распределители и соединительные фитинги Bonomi, Италия | 1 423,27 | 71,16 | 71,16 |
| 4 | **Фасонные части и запорная арматура из чугуна** (маховики, задвижки, кресты, клапаны, хомуты, фланцы, уплотнительные кольца и др.) | 29 039,21 | 1 451,96 | 1 451,96 |
| 5 | **Детали котлов** (расширительные сосуды, вентили, клапаны, манометры, разводки, теплообменники, термостаты, платы, реле, термопары идр.) **Fondital (Италия)** | 20 888,10 | 1 044,41 | 1 044,41 |
| 6 | Радиаторы «Фондитал» и комплектующие к ним (Италия) | 5 774,28 | 288,71 | 288,71 |
| 7 | **Комплектующие для систем наружной канализации из ПВХ и ПП** (манжеты, муфты, отводы, тройники и др.) **(Польша)** | 3 927,49 | 196,37 | 196,37 |
| 8 | **Водосточная система Каролина** (желоба, воронки, ревизии, трубы, углы, хомуты и др.) **(Польша)** | 4 773,62 | 238,68 | 238,68 |
| 9 | **Трубы из сшитого полиэтилена и фитинги системы «Упонор»** (трубы, кольца, муфты, тройники и др.) | 11 583,69 | 579,18 | 579,18 |
| 10 | **Трубы и фитинги из полипропилена для холодного/горячего водоснабжения, отопления** (трубы, муфты, тройники, угольники и др.) **HP trend, Чехия** | 6 018,56 | 300,93 | 300,93 |
| 11 | **Пресс-фитинги для металлополимерных труб** (муфты, тройники, угольники и др.) **Словакия** | 8 472,88 | 423,64 | 423,64 |
| 12 | **Детали котлов «Юникал»** (дымоходы, комплекты коаксиальные, переходные и пр.) **Италия** | 2 763,08 | 138,15 | 138,15 |
| 13 | Стальные и чугунные фасонные части малых диаметров (РФ) | 819,18 | 40,96 | 40,96 |
| 14 | **Термостатическая арматура** (клапаны, вентили) | 6 602,99 | 330,15 | 330,15 |
| 15 | **Латунные фитинги** (заглушки, краны, муфты, угольники и пр.) **Словакия** | 1 915,05 | 95,75 | 95,75 |
| 16 | **Комплектующие для систем наружного водопровода из ПВХ** (манжеты, заглушки и пр.) | 1 599,19 | 79,96 | 79,96 |
| 17 | **Трубы и фитинги системы КАН** (трубы РЕ, соединители, тройники, кронштейны) **Польша** | 362,40 | 18,12 | 18,12 |
| 18 | **Комплектующие для систем внутренней канализации** (планки, скрепки, уплотнения и пр.) **Польша** | 522,14 | 26,11 | 26,11 |
| 19 | **Металлопластиковая труба** (20х2, 26х3, 32х3) **и комплектующие (Италия)** | 844,05 | 42,20 | 42,20 |
| 20 | **Трубы** (ПЭ100 и ПЭ80) **и фасонные изделия из ПЭ, Беларусь** | 1 052,41 | 52,62 | 52,62 |
| 21 | Насос «Грюндфос» NB32-160/1/177 и комплектующие | 1 680,01 | 84,00 | 84,00 |
| 22 | **Комплектующие к смесителям** (вентили, наконечники, экраны) **Польша** | 53,65 | 2,68 | 2,68 |
| 23 | Переливы пластиковые для мойки (Ани-Пласт) РФ | 19,53 | 0,98 | 0,98 |
| | **Прочее оборудование, инструмент, мебель, расположенные по адресу: г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17** | | | |
| 24 | Плиты пенопол. теплоиз. ППТ-35-А 50х1 (5,5 м³), сетка кладки 100х100 2000х500 мм (0,018 т) | 147,49 | 7,37 | 7,37 |
| 25 | Европоддоны (11 шт.) | 14,52 | 0,73 | 0,73 |
| 26 | Плита газовая (1 шт.), баллоны (5,0 л – 4 шт) | 11,47 | 0,57 | 0,57 |
| 27 | **Электрооборудование** (выключатели, коробки, реле и пр.) | 34,34 | 1,72 | 1,72 |
| 28 | Офисное оборудование, инструменты, мебель | 426,55 | 21,33 | 21,33 |
| 29 | Подземный гидрант ДУ100, ковер из пластмассы | 303,51 | 15,18 | 15,18 |
| 30 | **Оборудование для обслуживания газовых котлов** (стабилизаторы напряжения, измерители давления газа) | 291,50 | 14,58 | 14,58 |
| 31 | Аппарат факсимильный Panasonic KX-FT (2 шт.) | 108,00 | 5,40 | 5,40 |
| 32 | Инструмент ручной расширительный 16/20/25 в комплекте, головки расширительные G&E | 21,60 | 1,08 | 1,08 |
| 33 | Источники бесперебойного питания (2 шт.) | 11,48 | 0,57 | 0,57 |
| 34 | Комплект-прессы ручные и гидравлические (7 ед.) | 658,80 | 32,94 | 32,94 |
| 35 | **Комплект мебели офисной** (кресла, столы, полка, стеллаж) | 583,20 | 29,16 | 29,16 |
| 36 | **Комплект мебели офисной** (столы, стулья, тумбы) | 97,20 | 4,86 | 4,86 |
| 37 | **Комплект мебели офисной** (столы, стулья, полки) | 280,80 | 14,04 | 14,04 |
| 38 | **Комплект мебели офисной** (столы, приставка, тумба) | 91,80 | 4,59 | 4,59 |
| 39 | **Шкафы для одежды, гардеробный** (10 шт.) | 270,00 | 13,50 | 13,50 |
| 40 | **Щиты пожарные** (откр. и закрыт.) (6 ед.) | 129,60 | 6,48 | 6,48 |
| 41 | Ручной пресс 14-20 в комплекте | 29,16 | 1,46 | 1,46 |
| 42 | Стол от разборки павильона выставочного | 37,80 | 1,89 | 1,89 |
| 43 | Устройство для разматывания труб | 37,80 | 1,89 | 1,89 |
| 44 | **Ноутбуки портативные (**HP, ASUS) (3 ед.) | 1 296,00 | 64,80 | 64,80 |

**Срок подписания договора купли-продажи**: не позднее 1 рабочего дня после проведения аукциона

**Срок оплаты**: в течение 3 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иной срок не определен договором купли-продажи

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 14.10.2017

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **27 ноября 2017 г. в 12.30,** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, офис ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **24 ноября 2017 г. до 18.00,** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |

**Задаток** перечисляется на р/с BY24 PJCB 3012 3008 8110 1000 0933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев код банка (БИК) PJCBBY2X. Получатель – ООО «СКТ ЗПТ», УНП 790104272. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «СКТ ЗПТ»

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления с предметами аукционов** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 8.00 до 17.30 (понедельник–пятница) по предварительному согласованию по тел. +375(29)631-19-51, Максим Александрович |

**Порядок оформления участия в аукционах и результатов торгов:**
аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение о задатке. Информацию о документах, необходимых для участия в аукционе, порядке его проведения, оформления результатов вы можете получить по телефону +375(44)729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович.
В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Контакты | +375 (29) 631-19-51, +375 (44)729-46-60, +375 (29) 112-28-43, jurist@sktzpt.by |

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 года

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2017 | на 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 62 346 | 72 406 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 520 | 550 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 329 774 | 163 995 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 181 079 | 230 623 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 575 227 | 897 594 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 716 045 | 2 385 463 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | – | – |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | – | 1 292 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | – | – |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 820 | 267 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 192 163 | 207 605 |
| 15 | **Автомобиль MAZ 6422 А8 330**, инв. №10300, 2008 г. в., **рег. №АЕ 0559-3**, состояние – технически неисправен. **Местонахождение:** г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **19 656,00** | 982,80 |
| 16 | **Полуприцеп бортовой MAZ 938660 044**, инв. №10511, 2008 г. в., **рег. №А 3205 А-3**, состояние – технически неисправен. **Местонахождение:** г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **5 292,00** | 264,60 |
| 17 | **Автомобиль GAZ-53 ВМШ 3.6 КО 503Б**, инв. №10010, 1987 г. в., **рег. №АЕ 6449-3**, тип ТС – грузовой специальный цистерна, состояние – рабочее. **Местонахождение:** г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **5 508,00** | 275,40 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12, конт. тел. по технике: 8 (044) 700-40-60 – Кучинский Владимир Александрович; конт. тел. по недвижимости: 8(044)769-19-61, 8 (0232) 58-43-11 – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2).** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 ноября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 ноября 2017 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи **в течение 5 (пяти) календарных дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 №607). **Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.09.2017 г., от 19.10.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8(029)126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Пашкоджваецца маладое лісце, парасткі, ягады. Хворыя лісты скручваюцца і засыхаюць. Верхавіны пашкоджаных парасткаў цямнеюць, перакрыўляюцца і гінуць.**

# Мучністая раса — хвароба парэчкі і агрэсту

**Заражаныя ягады перастаюць расці, усыхаюць і ападаюць, а белы мучністы налёт, які застаецца на галінках, ушчыльняецца і ператвараецца ў карычневую плёнку. Зніжаецца ўраджай ягад, пагаршаецца іх якасць — яны становяцца больш кіслыя і дробныя. Заражаныя кусты не даюць прыросту, слабеюць і пры моцным пашкоджанні гінуць.**





Узбуджальнік хваробы — грыб. Зімуе на пашкоджаных парастках, лістах і пладах расліны. Іх заражэнне адбываецца ў перыяд раскрыцця пупышак і распускання лісця або пасля завязвання ягад у цёплыя дні. Аптымальная тэмпература для развіцця хваробы 17—28 °С пры вільготнасці паветра 90—100%. У гарачае, сухое надвор'е развіццё хваробы прыпыняецца.

Увесну споры грыба выкідваюцца з сумак і заражаюць маладыя часткі расліны. На пашкоджанай грыбам паверхні ліста або сцябла нарастае белы павуціністы налёт. Гэта міцэліі грыба. Затым на міцэліі ўтвараюцца споры — канідзіі, якія па сваім выглядзе нагадваюць муку. Канідзіямі і заражаюцца расліны ў летні перыяд.

Паступова белы мучністы налёт становіцца буры, ушчыльняецца, на ім з'яўляюцца чорныя кропкі — пладовыя целы, дзе ў торбачках даспяваюць позна ўвосень або на працягу ўсёй зімы аскаспоры.

Меры барацьбы з узбуджальнікам хваробы накіраваны на знішчэнне міцэлію і спор грыба і ўключаюць у сябе мерапрыемствы па знішчэнні і прафілактычныя прыёмы.

Прафілактычныя прыёмы — гэта і агратэхніка вырошчвання, і сістэма ўгнаенняў. Пасля збору ягад глебу пад кустамі трэба перакапаць віламі, падсыпаць глебы ўнутр куста і ўгнаіць. Арганічныя ўгнаенні ўносяць адзін раз у 3—4 гады па 10—15 кг на куст, суперфасфат і сернакіслы калій — пад перакопку глебы штогод.

Азот узмацняе паражэнне раслін мучністай расой, таму пры добрым росце аднагадовых парасткаў яго лепш не ўносіць. Калі глеба кіслая, то пад чорныя парэчкі замест фосфарнага і калійнага ўгнаенняў лепш уносіці драўнянны попел — тры шклянкі на куст. Замяняе мінеральныя ўгнаенні раствор каравяку ці птушыны памёт, разведзены адпаведна ў 10 і 20 разоў. На адзін дарослы куст уносяць два вядры такога раствору. У выпадку сухога надвор'я кусты трэба паліць, апалае лісце сабраць, спаліць або закампаставаць. Расліны старанна агледзець, пашкоджаныя парасткі выразаць і спаліць, бо яны з'яўляюцца адной з асноўных крыніц заражэння. Увесну агляд і абразанне пашкоджаных верхавін парасткаў паўтараюць, захопліваючы на 2—3 пупышкі і здаровую частку парасткаў.

Калі заражэнне кустоў было моцнае, вясной перад набраканнем пупышак, для знішчэння інфекцыі, якая зімавала, іх апырскваюць 2-працэнтным растворам нітрафену (вынішчаючая апрацоўка). У перыяд вегетацыі праводзяцца 4—5 прафілактычных апрацовак: перад цвіценнем, адразу пасля яго і ў далейшым кожныя 8—10 дзён.

У вільготнае надвор'е варта апырскваць часцей, у сухое і гарачае — апрацоўкі можна прыпыніць. За тры тыдні да ўборкі ўраджаю апырскванне спыняюць, а затым аднаўляюць, каб засцерагчы ад заражэння маладыя парасткі.

Для прафілактычных апрацовак садоў рэкамендуецца ўжываць адзін з пералічаных даступных раствораў:

— содава-мыльны (на 10 л вады па 50 г кальцыніраванай соды і гаспадарчага мыла);

— попельна-мыльны (300 г прасеянага попелу пракіпяціць на працягу паўгадзіны, раствор, які адстаяўся, працадзіць, развесці вадой да 10 л, дадаць 40 г мыла);

— трынатрыйфасфату (50 г на вядро вады).

Замест пералічаных хімічных раствораў можна праводзіць прафілактычныя апырскванні настоем каровінага гною або сянной пацярухі: 1 частку яе заліваюць 3 часткамі вады, настойваюць 3 дні, працэджваюць і разводзяць у тры разы.

У такім настоі развіваюцца бактэрыі, згубныя для грыбніцы ўзбуджальніка мучністай расы. Апырскванне праводзяць у тры тэрміны — да цвіцення, пасля цвіцення і восенню перад лістападам.

Калі няма каравяку, можна ўзяць 1 л сыроваткі, разбавіць у 9 л вады і апырскваць расліны. Апырскванне праводзяць пад вечар ці ў пахмурнае зацішнае надвор'е.

## ВЫБРАЦЬ АДЛЕГЛАСЦЬ ПАМІЖ ДРЭВАМІ, КУСТАМІ

**Яшчэ ёсць час выкапаць пасадачныя ямы, а пасадкай можна заняцца вясной**

**Адлегласць паміж пладовымі дрэвамі і ягаднымі кустамі залежыць ад сілы іх росту і велічыні кроны ў дарослым стане.**

У сярэднім рэкамендуецца пакідаць паміж яблынямі і грушамі з аб'ёмнымі кронамі на прышчэпах, якія растуць моцна, — 4 м, на карлікавых прышчэпах — 2,5 м, вішні — 3 м, слівы, абляпіхі і чарнаплоднай рабіны — 2,5 м. У ягадніках кусты размяшчаюць больш кампактна, пакідаючы паміж чорнай, чырвонай і белай парэчкай — 1,5 м, агрэстам — 1,5 м, малінай і ажынай — 0,5 м.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.37 | 17.11 | 8.34 |
| Віцебск — | 8.32 | 16.55 | 8.23 |
| Магілёў — | 8.27 | 17.01 | 8.34 |
| Гомель — | 8.17 | 17.03 | 8.46 |
| Гродна — | 8.51 | 17.27 | 8.36 |
| Брэст — | 8.46 | 17.34 | 8.48 |

### Месяц

*Маладзік 18 лістапада. Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

*Пр. Канстанціна. К. Амелі, Марыі, Альберта, Артура, Леапольда.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**На вуліцы дзьме такі моцны вецер!**

**Сёння бачыў, як мужык выплёўваў акурак пяць разоў запар.**

Лепшы спосаб праверыць мужчыну на вернасць — задаць спячаму мужу раніцай пытанне:

— Да сваёй пойдзеш, ці ў мяне застанешся?

**З часопіса «Ваш чатырохногі сябар»:**

**«Калі вашаму гадаванцу часта даводзіцца заставацца ў поўнай адзіноце, без прагулак, раім вам навучыць яго адкрываць дзверы прыбіральні лапай. Вось убачыце, у вас атрымаецца!»**

**З ліста ў рэдакцыю:**

**«Атрымалася! Зараз наш чатырохногі сябар не толькі ходзіць міма ўнітаза, але яшчэ і крадзе з халадзільніка каўбасу!»**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

## Даты | Падзеі | Людзі

### 15 ЛІСТАПАДА

**1917** год — савецкі ўрад абвясціў «Дэкларацыю правоў народаў» — адзін з першых актаў савецкай улады, які вызначыў асноўныя напрамкі нацыянальнай палітыкі савецкай дзяржавы.

**1925** год — у Мінску ў эфір выйшла першая перадача беларускага радыё. (Цяпер — у складзе Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь). Радыёстанцыя РВ-10 імя Саўнаркама БССР стала трансліраваць перадачы ў радыусе да 300 км працягласцю 30 хвілін у суткі. У Беларусі стала фарміравацца радыёперадавальная сетка. У Мінску і Гомелі былі ўстаноўлены магутныя радыёперадатчыкі тыпу «Малы Камінтэрн», у 25 раённых цэнтрах — радыёпрыёмнікі калектыўнага карыстання» У Мінску была пабудавана 75-метровая драўляная мачта з антэнамі, побач абсталявана студыя. З 1928 года ў рэспубліцы пачало развівацца праваднное вяшчанне. На Беларускім радыё ўведзена тыпавая тыднёвая сетка вяшчання, у якой была закладзена адрасная перадач у залежнасці ад прафесійнай і ўзроставай прыналежнасці слухачоў, створаны сімфанічны аркестр і першы радыёўніверсітэт з тэхнічным, сельскагаспадарчым і агульнапалітычным факультэтамі.

**1947** год — нарадзіўся Анатоль Іванавіч Ярмоленка, беларускі эстрадны спявак, народны артыст Беларусі. З 1974 года — мастацкі кіраўнік і вядучы саліст творчага аб'яднання «Студыя «Сябры». Першы выканаўца многіх папулярных песень беларускіх і расійскіх кампазітараў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны.



**1957** год — у Мілане выдавецтва «Фельтрынелі» ўпершыню апублікавала раман Барыса Пастэрнака «Доктар Жывага» (на італьянскай мове). Да канца 1958 года кніга была перакладзеная на 18 моў, прынёсшы аўтару сусветную славу. У тым жа 1958 годзе Барысу Пастэрнаку была прысуджана Нобелеўская прэмія па літаратуры, ад якой ён быў вымушаны адмовіцца.

### Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт, перакладчык:**

*«Хоць не забылі б сейбітавы дзеці,*
*Што сіла — у сіле роднае зямлі».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4346.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2017 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

15 лістапада 2017 г. №43 (427)




стар. 5

**Зямля стамілася чакаць**



стар. 6

**Інвестары сталі разборлівымі**



стар. 8

**Турыстычныя разыначкі Кобрына**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ПУСТЫЯ ДАМЫ Ў АСНОЎНЫМ... ЗНОСЯЦЬ

## А можна было б уцягваць іх у гаспадарчы абарот



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Пакрывіўся дах, пустыя вачніцы акон, праваліласся падлога... Карціна непрывабная, хоць для нашай глыбінкі і тыповая — пустых дамоў у вёсках шмат. У 2012 годзе выдадзены Указ №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустых і старых дамоў у сельскай мясцовасці». Ёсць дакладны алгарытм дзеянняў, але прыйшла пара яго ўдасканаліць.**

**На мінулай нарадзе, што датычылася праекта новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса, лідар нашай дзяржавы закрануў тэму старых дамоў. Праблема даўно наспела, такія будынкі трэба прыбіраць, а землі вяртаць у абарот. Але да гэтага неабходна будзе «падвесці» нарматыўна-прававы акт, каб мясцовыя ўлады не бегалі за гора-ўладальнікамі, якім гэтая нерухомасць належыць толькі на паперы. Як будзе вырашацца праблема і якія змены ў заканадаўстве могуць з'явіцца ў найбліжэйшы час — карэспандэнту «Звязды» расказвае старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ.**

стар. 4

ЖЫВЫ ДЫЯЛОГ

# ГЭТА ВАМ НЕ ФУТБОЛ

**Жыхары Уваравіцкага сельсавета праверылі, ці сапраўды чыноўнікаў турбуюць клопаты вяскоўцаў.**

**На фотаздымку, які прынёс з сабою жыхар пасёлка Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна Віктар Судакоў, вуліца Базарная нагадвае неахайныя разоры.**
**Мужчына кажа, што звяртаўся да ранейшага старшыні райвыканкама і ў сельсавет, але праблема засталася без зруху.**
**— Калі «насядаў», прысылалі машыну, работнік выгружаў прычэп пяску, і на гэтым работа лічылася выкананай, — дзеліцца жыхар набалелым. — Пасля аднаго са званкоў на дарогу выгрузілі кучу друзу з-пад разабранага будынка, вось толькі пасля дажджу вуліца ўсё роўна «плыве».**
**Урэшце, Віктар Віктаравіч вырашыў занесці скаргу на «Жывы дыялог». Форма работы з насельніцтвам цікавая, кіраўнік у раёне новы — а раптам сапраўды дапамогуць?**

### Твар да твару

Насамрэч, фармат «Жывога дыялогу» існуе даўно, толькі раней на Буда-Кашалёўшчыне падобныя мерапрыемствы праходзілі пад іншымі назвамі. Потым быў перапынак, і вось ужо год як работа аднавілася. Сутнасць яе — размова насельніцтва і раённых кіраўнікоў твар да



твару, раскрыццё любых праблем, на якія ў чыноўніка магло б «замыліцца вока».

Форма правядзення сустрэчы наступная: кожны месяц рабочыя групы райвыканкама наведваюць усе населеныя пункты — ад буйных да самых дробных вёсачак, — якія ўваходзяць у склад сельсавета, сустракаюцца з насельніцтвам і запісваюць прапановы. Вечарам адбываецца агульнае пасяджэнне ў цэнтральным пасёлку сельсавета, дзе таксама можна задаць пытанне. Кіраўнік раёна выслухвае даклады кожнай рабочай групы, абмяркоўвае магчымыя варыянты рашэння праблемы і адразу дае даручэнне начальніку адпаведнай структуры выправіць становішча. Адначасова складаецца пратакол сустрэчы старшыні, каб можна было зафіксаваць тэрмін і па яго сканчэнні спытаць у выканаўцы, што было зроблена па праблеме, які вынік і калі работа не выканана, што гэтаму перашкодзіла.

Пасёлак Уваравічы даволі вялікі, а мясцовых жыхароў раённае начальства ведае па іх актыўнасці. Вось і гэтым вечарам у актавую залу Дома культуры сабралася каля 100 чалавек — некаторыя з пытаннямі, але большасць па цікаўнасці.

Напачатку старшыня Буда-Кашалёўскага райвыканкама Андрэй Гарбачоў павітаў усіх прысутных:

— Для мяне гэта новая, цікавая форма работы, якая падаецца вельмі перспектыўнай. На пасадзе кіраўніка я пакуль усяго толькі паўтара месяца, але спадзяюся, сёння мы атрымаем плён ад супрацоўніцтва. У любым выпадку, я не люблю гульню ў папяровы футбол, калі ўстановы адсылаюць адна адной стосы дакументаў на манер мяча. Будзем працаваць на вынік.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# МАСТАЦТВА, ШТО АДЛЮСТРОЎВАЕ ЧАС

*Гэту дату са свядомасці не выкрасліш*

**Выстаўка фотаработ легендарнага фотарэпарцёра Юрыя ІВАНОВА «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...», прысвечаная 100-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, адкрылася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Мінску. У адкрыцці ўзяў удзел старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**



Экспазіцыя ўключае 100 здымкаў, зробленых з 1962 па 1991 год. У творчасці аўтара знайшлі адлюстраванне як гісторыі простых людзей, знакамітых грамадскіх і культурных дзеячаў, так і сцэны з жыцця мінулай эпохі.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента падзякаваў Юрыю Іванову за цікавы выставачны праект і адзначыў, што тое высокае мастацтва, якое дэманструецца сёння ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», яшчэ раз дазваляе пераканацца ў вялікім майстэрстве мастака. На яго думку, з кожнай эпохі трэба браць самае лепшае. «У Беларусі гэта ажыццяўляецца дастаткова паспяхова і ў пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, калі падыходы, якія сябе апраўдалі ў эканоміцы або ў сацыяльнай палітыцы, атрымліваюць развіццё на сучасным этапе», — сказаў ён.

«Гэтая выстаўка выпакутавана сэрцам, душой. Не адзначыць 100-годдзе рэвалюцыі нельга — у той час жылі мае бацькі, дзядзькі, цёткі, сёстры, стрыечныя браты, мае сябры, — падкрэсліў Юрый Іваноў. — Гэтую дату са свядомасці выкрасліць немагчыма, таму што, як у адной вядомай песні пяецца, «гэта наша з табой біяграфія». Фотаздымкі — зрэз часу, падобны колцам дрэва».

# НЕ МЕНШ ЗА ТЫСЯЧУ РУБЛЁЎ

*Міхаіл Мясніковіч наведаў Брэсцкую вобласць*

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Міхаіл МЯСНІКОВІЧ правёў у Баранавічах нараду са старшынямі гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў і іх намеснікамі.**

Падчас яе абмеркаваны пытанні развіцця сельскагаспадарчай галіны Брэсцкай вобласці па выніках дзевяці месяцаў 2017 года. Таксама разгледжаны ход выканання даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па выхадзе на ўзровень заробатнай платы не менш за тысячу беларускіх рублёў. Асаблівая ўвага ўдзелена адказнасці кіруючых кадраў за выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў.

# ЭКАНОМІКА, РЭГІЁНЫ, ДЫЯЛОГ

*У Савеце Рэспублікі прынялі пасла Беларусі ў Балгарыі*

**Спікер верхняй палаты беларускага парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ прыняў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя, Грэчаскай Рэспубліцы і Рэспубліцы Кіпр (па сумяшчальніцтве) Уладзіміра ВАРАНКОВІЧА. У сустрэчы таксама ўзяў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.**

На сустрэчы абмяркоўваліся стан і далейшае развіццё двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Балгарыі, уключаючы гандлёва-эканамічныя пытанні і міжпарламенцкае ўзаемадзеянне. Уладзімір Варанковіч праінфармаваў аб парадку дня пасяджэння Беларуска-Балгарскай Міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, якое праходзіць у Мінску.

Міхаіл Мясніковіч зрабіў акцэнт на неабходнасці паглыблення эканамічнага супрацоўніцтва, пашырэння рэгіянальных сувязяў і актывізацыі парламенцкага дыялогу паміж нашымі краінамі. У ходзе размовы была закранута таксама праблематыка адносін нашай краіны з Грэчаскай Рэспублікай і Рэспублікай Кіпр.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

УЖО СЁННЯ

# Па кроках да мэт

**Віцэ-спікер верхняй палаты бярэ ўдзел у семінары**

**ПАЗІЦЫЯ Беларусі ў рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця (МУР) на сённяшні дзень і плануемыя вынікі да 2030 года будуць разгледжаны на семінары-нарадзе «Мэты ўстойлівага развіцця — імплементацыя на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях», які адбудзецца 15 лістапада ў Мінску. Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА і пастаянны каардынатар ААН — пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА прадставяць аўдыторыі пакрокавы шлях краіны да дасягнення вынікаў.**

У цэнтры ўвагі падчас семінара будуць пытанні фарміравання нацыянальнай сістэмы паказчыкаў для маніторынгу МУР, іх рэалізацыя ў эканамічнай, экалагічнай і сацыяльнай сферах, асноўныя падыходы да фарміравання нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў названым кантэксце.

Удзельнікі мерапрыемства — кіраўніцтва некалькіх міністэрстваў, Нацыянальнага статыстычнага камітэта, а таксама прадстаўнікі мясцовых органаў улады, навуковай супольнасці, грамадскіх і міжнародных арганізацый, бізнесу, міжнародныя эксперты. Яны азнаёмяцца з беларускім і замежным вопытам распрацоўкі і рэалізацыі мясцовых стратэгій устойлівага развіцця, абмяркуюць партнёрства дзяржавы, бізнесу і грамадскіх арганізацый для дасягнення МУР. Асобная ўвага з улікам міжнароднага вопыту будзе ўдзелена пытанню лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця.

На семінары таксама адбудзецца прэзентацыя публікацыі «Стартавыя пазіцыі Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця». Для прасоўвання МУР у Беларусі па праекце ПРААН былі распрацаваны нацыянальныя версіі створаных ААН лагатыпаў МУР (на рускай, беларускай і англійскай мовах). Нацыянальны варыянт лагатыпа будзе таксама прэзентаваны на мерапрыемстве.

Семінар-нарада праводзіцца па праграме праекта «Падтрымка дзейнасці Нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця і ўмацаванне ролі парламента ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця». Міністэрства замежных спраў выступае нацыянальным выконваючым агенцтвам. Партнёры праекта — Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу і Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

# ГЭТА ВАМ НЕ ФУТБОЛ

## Вечныя пытанні сельскай мясцовасці

За дзень рабочыя групы аб'ехалі восем населеных пунктаў. Дзесьці на сустрэчу прыходзіла 15 жыхароў, дзесьці 50, у залежнасці ад памеру вёскі.

Праблемы прыносілі розныя. Але скаргі на дрэнныя дарогі гучалі з кожнага даклада. Якімі толькі эпітэтамі не надзялялі бяду вяскоўцы — параўноўвалі праезную частку з пральнай дошкай, расказвалі пра шчэбень, што сплывае ў канаву разам з дажджыкам...

Андрэй Гарбачоў даручыў начальнікам камунальных службаў і дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення разабрацца з праблемай. Выканаць, пакуль зіма не прыйшла, ямачны рамонт, зрабіць падсыпку на грунтоўках. Праблему паставілі на кантроль і вызначылі тэрміны выканання.

Жыхароў вёскі Завідаўка непакоіць вулічнае асвятленне. Сяльчане прасілі на восень-зіму памяняць схему ўключэння святла і ліхтар, размешчаны перад лецішчамі, перанесці бліжэй да цэнтра вёскі. Старшыня раённага Савета дэпутатаў Алена Алексіна растлумачыла жыхарам, што ліхтары на слупах не толькі асвятляюць падвор'і. Іх асноўнае прызначэнне — стварыць добрую бачнасць па вуліцы, у тым ліку для аварыйных і іншых службаў. Аднак Алена Іванаўна прапанавала ўнесці скаргу вяскоўцаў у пратакол сустрэчы, каб адпаведныя ўстановы ще вывучылі і прыйшлі з жыхарамі да кампраміснага рашэння.

Для сельскай мясцовасці важная праблема пітной вады. Пра яе якасць цікавіліся многія. Старшыня Савета дэпутатаў накіравала даручэнне раённаму цэнтру гігіены і эпідэміялогіі і «Буда-Кашалёўскаму камунальніку», каб гэтыя дзве арганізацыі ўзялі пробы і потым публічна праінфармавалі пра вынікі лабараторнай праверкі.

Яшчэ жыхароў Уваравіцкага сельсавета турбуюць праблемы ачышчэння шахтавых калодзежаў, пыл на вуліцах ад сельгастэхнікі, перапады электраэнергіі ў сетцы, частыя прарывы водаправода, знос пустых будынкаў, медыцынскае абслугоўванне на месцах, пабудова пажарных вадаёмаў, рамонт старых дамоў... Улады паабяцалі разабрацца з усімі гэтымі пытаннямі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*



## Каму замінаюць каровы?

— Ступень запатрабаванасці праблемы высвятляем праз параўнанне колькасці зваротаў грамадзян, — тлумачыць Алена Алексіна. — Запыт альбо вырашаем, альбо тлумачым насельніцтву, чаму задача пакуль не можа быць рэалізавана, альбо ідзём на кампраміс. Зразумела, што, калі праблема доўгатэрміновая і патрабуе значнага фінансавання, выканаць абяцанне адразу не атрымаецца. Але гэта не азначае, што мы адклалі зварот на далёкую паліцу.

Грамадзяне з вёскі Радзеева прыйшлі на сустрэчу ў складзе 50 "дэлегатаў" і вострых пытанняў задавалі шмат. Прапаноўвалі разабрацца з затрымкамі ў рабоце пошты, спілаваць на могілках аварыйныя дрэвы, арганізаваць дзіцячую пляцоўку. Яшчэ непрыемнасці вяскоўцам дастаўляе былая школа. Нерабочы будынак выкупіў уласнік і пасяліў у памяшканнях жывёлу. У выніку летам на вёску ідзе дрэнны пах.

Незвычайную просьбу пачулі прадстаўнікі райвыканкама ў вёсцы Лапічы. Жыхары прапанавалі не садзіць кукурузу на месцы, дзе раней стаялі пустуючыя дамы. Як аказалася, летам высокія сцяблiны падступаюць да самых падвор'яў, а вяскоўцы баяцца, што ў зараснiках могуць хавацца дзікія жывёлы і бадзяжныя сабакі.

Адсутнасць банкамата ва Уваравічах аказалася куды больш глыбокім пытаннем, чым магло падацца. Для яго ўстаноўкі патрэбна дзве тысячы трымальнікаў картак банка ў населеным пункце, а таксама пэўны абарот грашовых сродкаў за дзень.

— Сапраўды, калі разглядаць толькі Уваравічы, то патрэбнай колькасці трымальнікаў картак тут няма. Але гэта даволі буйны пасёлак, побач існуюць дробныя населеныя пункты, тут працуе аўтастанцыя. І адсутнасць магчымасці праводзіць аперацыі з грашыма становіцца сур'ёзным недахопам. Я паспрабую наладзіць перапіску з Беларусбанкам, магчыма, давядзецца пасылаць запыт на вобласць, — паабяцаў старшыня райвыканкама.

* * *

Пасля таго як даклады па «палявой рабоце» скончыліся, прыйшла чарга скрынкі для ананімных зваротаў. За месяц яе перавозілі па вёсках сельсавета, каб потым адчыніць падчас асноўнай сустрэчы. Яшчэ адна частка работы з насельніцтвам — пытанні з залы.

— Сёння мы выкарыстоўваем разнастайныя формы кантакту з насельніцтвам, каб кожны меў магчымасць выступіць, — падсумоўвае Андрэй Гарбачоў. — Калі чалавек саромеецца, ён апускае зварот у скрыню. Калі хоча абвясціць праблему перад усімі — выбірае заяву на агульнай сустрэчы. Мы праводзім анкетаванне насельніцтва па тэрыторыі, просім выставіць адзнакі ўсім службам, якія аказваюць паслугі, — медыцыне, культуры, камунальнай гаспадарцы і г. д. Я лічу, што колькасць людзей, якія прыйшлі на мерапрыемства, сведчыць, што ўладам людзі давяраюць і спадзяюцца на станоўчае вырашэнне. Былі пытанні лёгкія, былі падзякі, але гучалі і сапраўды «балючыя» тэмы, над якімі давядзецца папрацаваць.

Мы, у сваю чаргу, будзем спадзявацца, што ўлады і жыхары раёна сапраўды знайшлі агульную мову, а добры вопыт захочуць пераняць суседзі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** yurgel@zviazda.by

# ТРЫ КІЛАМЕТРЫ ШЭСЦЬСОТ МЕТРАЎ

## Што можа паслужыць імпульсам для развіцця вёскі Гарадзечна?

**ГАРАДЗЕЧНА, што ў Пружанскім раёне, увайшло ў гісторыю найперш як месца бітвы рускай арміі з напалеонаўскімі войскамі ў вайне 1812 года. Насамрэч войскі праціўнікаў сышліся больш за 200 гадоў таму ва ўрочышчы Вялікая Гара, за некалькі кіламетраў ад вёскі, але бітва атрымала назву Гарадзечненская. Цягнуўся той крывавы бой цэлы дзень. Армія генерала Тармасава пацясніла аўстра-саксонскі корпус. Не дзясяткі, не сотні — тысячы салдат з абодвух бакоў засталіся ў гэтай зямлі.**

### Мост ад мінулага ў будучыню

Вось і нядаўна, літаральна два гады таму, прайшло чарговае перапахаванне астанкаў удзельнікаў бітвы, якія знайшлі спецыялісты 52-га пошукавага батальёна.

А тады, пасля перамогі, генерал Тармасаў, які стаў губернатарам Масквы, не забыў вялікі бой з велізарнымі ахвярамі і паспрыяў узвядзенню храма ў Гарадзечне. У 1825 годзе Пакроўскі сабор асвяцілі на свята Пакрова ў гонар «Храбрых сыноў Расіі». Доўга служыла царква мясцоваму люду. Але ў савецкія часы была фактычна разбураная. Засталіся фундамент ды фрагменты сцен.



Старшыня сельскага Савета Сяргей ЛАПУКА.

І тады ж, у савецкія часы, за яе аднаўленне ўзяўся калгас імя Дзяржынскага. Тагачасны старшыня Мікалай Цыпурка расказаў карэспандэнту газеты, што падштурхнула яго на гэты крок народная ініцыятыва. «Перад планёркай, якая ўлетку пачыналася ў сем раніцы, мяне ўжо чакалі бабулькі-актывісткі, якія прыходзілі са сваёй просьбай кожны дзень. Пачытаў гістарычныя звесткі… А 80-я гады былі, самі ведаеце, якія — перабудова, запахла ў паветры дэмакратыяй. Рашыў узяцца. Тым больш, што добрая цэгла была у паўразбураных гаспадарчых пабудовах былога панскага маёнтка. Ну а тэхніка, вядома, працавала калгасная. Праўда, на аплату працы рабочых людзі збіралі грошы», — успамінаў Мікалай Аляксандравіч.

І ўсё ж на пачатку 90-х крымінальную справу за нямэтавае расходаванне сродкаў на старшыню завялі. Выратаваў яго ад пераследу распад Саюза. Але царкву адбудавалі, асвяцілі яе ў 1991 годзе. Цяпер гэта адна з галоўных славутасцяў вёскі.

Да гістарычных аб'ектаў цяпер можна аднесці і школу, пабудаваную яшчэ за польскім часам. Дыхтоўны драўляны будынак называюць роднай школай усе пакаленні гарадзечненцаў аж да гэтага часу. Будынак 1938 года ў 2009—2010 гадах перажыў капітальны рамонт, але ў 2016-м… школу закрылі. Прычынай стала малая колькасць вучняў. Цяпер тут знаходзіцца дзіцячы садок, працуе адна група, якую наведваюць восем дашкольнікаў. Хоць у вёсцы лічаць, што пачатковая школа ў Гарадзечне магла б заставацца. Калі пасля закрыцця паўстала пытанне падвозу дзяцей, 35 вучняў з названай і суседніх вёсак не памяшчаліся ў школьны аўтобус. Дарэчы, тут спадзяюцца, што школа ўсё ж можа вярнуцца на ранейшае месца.

### Новыя і старыя вуліцы

Жылля пабудавана многа. Адны вуліцы ўзводзіліся яшчэ ў часы былога калгаса, іншыя, новыя, выраслі з так званых прэзідэнцкіх домікаў. Побач з вёскай пабудавалі буйны жывёлагадоўчы комплекс сельгаспрадпрыемства «Шані-аграпрадукт», на якім у асноўным і занятыя гаспадары тых дамоў.

Пустуючых хат, закінутых і занядбаных, тых, што маглі б трапіць пад «соты» Указ, у Гарадзечне няма. Тыя, што застаюцца без гаспадароў, даглядаюць і падтрымліваюць дзеці. Вялікая па пружанскіх мерках вёска выглядае дагледжанай, вуліцы ўнутры населенага пункта заасфальтаваныя.

— Сюды прыемна ездзіць, цягне на сваю радзіму, — гаворыць Юрый Чыжэўскі. Юрый Яўгенавіч працуе вадзіцелем у аўтапарку, але кожную вольную хвіліну з жонкай Ірынай Уладзіміраўнай праводзяць на бацькоўскай сядзібе. І зрабілі з уласнага падворка, а таксама прылеглага ўчастка, сапраўды райскі куток. Аказваецца, не ўкладваючы нават вялікіх грошай, але з дапамогай фантазіі і любові можна стварыць прыгажосць і камфорт.

Дарэчы, ранейшыя гаспадары не цясніліся, будавалі дамы на вялікіх участках, таму ёсць прастор для прыкладання рук. Паводле слоў Юрыя Чыжэўскага, многія сябры яго юнацтва таксама ездзяць сюды, даглядаюць бацькоўскія хаты. Ад Пружан тут усяго нейкія два дзясяткі кіламетраў. Але… усе наракаюць на праблемны кавалак дарогі.

### Звярталіся ў розныя інстанцыі

**Старшыня Шаняўскога сельскага Савета дэпутатаў Сяргей ЛАПУКА** не раз засякаў на спідометры: ад трасы, якая злучае Пружаны з абласным цэнтрам, да ўезда на вясковую вуліцу — 3600 метраў гравійкі. Дарога гэта даволі шырокая, яе даглядае ДРБУ-140. Кіраўнік мясцовай улады гаворыць, што дарожнікі вельмі добра робяць сваю справу, грэйдзіраванне і абслугоўванне ўчастка дарогі праводзіцца фактычна кожны месяц. Але ж кожны месяц гэтая дарога і разбіваецца.

У Гарадзечне знаходзіцца лясніцтва. Велікагрузныя лесавозы вязуць драўніну патокам, і амаль кожная машына заходзіць у вёску, каб зрабіць адзнаку ў дакументах. Такім чынам транспарт праходзіць па гэтым участку дарогі двойчы, з лесу — у вёску і назад. Зноў жа машыны сельгаспрадпрыемства ідуць на комплекс і адтуль — з кармамі і рознай прадукцыяй. Як сказаў з гэтай нагоды адзін калгасны вадзіцель: «Ездзім, бо лятаць жа не можам». А пройдзе дождж ці мокры снег, і дарога пакрываецца ямінамі.



Юрый ЧЫЖЭЎСКІ.

— Як на грэх, заўсёды ў такую пару, калі дарогу разбілі і не паспелі прагрэйдзіраваць, прывозяць бацькі маладых спецыялістаў на «агледзіны», — расказвае загадчыца дзіцячага садка Галіна Гадуйка. — І адразу расчараванне: «Вой, якая тут дарога!» Аднойчы да нас правяраючыя прыехалі і з парога: «Ну і дарогі ў вас!» А хіба мы вінаватыя, хіба мы не прасілі, не звярталіся ў самыя розныя інстанцыі? — задае рытарычнае пытанне Галіна Уладзіміраўна. — Мы плацім такі ж дарожны збор, як і жыхары горада. Але чаму мы павінны штодня ехаць па дарозе, якая псуе машыну, а гараджане па роўнай?

Жыхары вёскі не раз хадзілі на прыёмы да дэпутатаў парламента ад іх раёна. Дэпутаты абяцаюць паспрыяць па меры магчымасцяў, але ідзе час, народныя выбраннікі мяняюцца, а дарога застаецца.

— Мы спадзяваліся, што асфальтаванне названага ўчастка дарогі ўключаць у план 2018 года, але канчатковы пералік аб'ектаў на будучы год пакуль не атрымалі, — сказаў карэспандэнту газеты **начальнік ДРБУ-140 прадпрыемства «Брэстаблдарбуд» Аляксандр СУБОТА.** — Праўда, указаная дарога ўвайшла ў праграму работы да 2020 года. Калі да яе дойдзе чарга, дакладна паведаміць не магу. Усё ўпіраецца ў фінансаванне.

### Не намераны здавацца

І ўсё ж старшыня сельскага Савета дэпутатаў Сяргей Лапука лічыць, што «Брэстаблдарбуд» можа яшчэ ўключыць у планы дарогу на Гарадзечна. Тым больш, што кіраўнік дзяржавы апошнім часам вельмі пільную ўвагу ўдзяляе прывядзенню ў парадак мясцовых дарог. А тут жа ўсяго кавалак. Калі ж падысці па-гаспадарску і падлічыць сродкі, якія трацяцца на абслугоўванне за год, ды памножыць на гадоў пяць, то стане відавочным, што падтрыманне дарогі ў цяперашнім выглядзе таксама дарагое задавальненне.

Яшчэ больш замацаваўся ў сваіх намерах кіраўнік мясцовай улады, калі ў Гарадзечна прыехаў прадпрымальнік, каб паглядзець гаспадарчую пабудову былога панскага палаца пад будучую карчму. Паглядзеў і сказаў, што ўзяўся б за гэты праект, каб была добрая дарога. Калі паставіць указальнік на шашы, што за тры кіламетры чакае пункт грамадскага харчавання, людзі збочвалі б, — пры наяўнасці асфальту. А так — выбачайце…



Карчма, што чакае інвестара.

Сяргей Лапука ўпэўнены, што і цырульнік знайшоў бы работу ў вёсцы, дзе жыве амаль дзве сотні чалавек, і іншыя бытавыя паслугі могуць прапанаваць людзі, якія пакуль жывуць у горадзе. Ажыла б вёска з прыгожай назвай і цікавай гісторыяй, атрымала б новы імпульс развіцця. Ды цана пытання — усё тыя ж тры кіламетры дарогі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

*Пружанскі раён.*

ШТО ЗРОБЛЕНА?

# ЖЫЛЫЯ ДАМЫ, КРАМЫ І ДЗІЦЯЧЫ САДОК...

**Адкрыццё шэрагу сацыяльна значных аб'ектаў у Магілёўскай вобласці па традыцыі было прымеркавана да лістападаўскіх свят.**

У Бабруйску пасля рэканструкцыі запрацаваў абноўлены процітуберкулёзны дыспансер па вуліцы Гогаля (філіял гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі імя Марзона). Адрамантаваны кабінеты, пераабсталяваны рэнтгеналагічны кабінет, закуплена новае медыцынскае абсталяванне. На вуліцу Гогаля пераехала і дыспансернае аддзяленне, цяпер усе службы бальніцы знаходзяцца ў адным будынку.

У Слаўгарадзе адкрылі два гандлёвыя аб'екты, а ў Магілёўскім раёне каля вёскі Ільінка ўведзены ў дзеянне аб'ект прыдарожнага сэрвісу ад прыватнага прадпрыемства «Мясны клуб». У Клімавічах 20 сем'яў справілі наваселле ў новым жылым доме па вуліцы Леніна, а ў Хоцімску адкрылі дзіцячы дом сямейнага тыпу пасля капрамонту. На лістапад прызначана адкрыццё новай крамы, увод жылога дома і спартыўнага аб'екта ў Касцюковічах, Крычаве, Глуску. А ў рабочы пасёлак Татарка Асіповіцкага раёна прыйшоў прыродны газ. У лістападзе пачне работу новы завод па вытворчасці металапрофіляў ТАА «ЯшкаўБудКомпані» ў Магілёўскім раёне. А ў Магілёве маленькіх пацыентаў прыме новае гематалагічнае аддзяленне абласной дзіцячай бальніцы.

— Шмат што зроблена ў горадзе для аховы здароўя грамадзян, — адзначыла намеснік **старшыні Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Зінаіда ПЯНЬКОВА.** — Сёлета Магілёў закупіў тры машыны хуткай медыцынскай дапамогі, за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў гарадскіх паліклініках №№ 1, 5 і 11 зроблены сучасныя рэнтген-кабінеты з найноўшым абсталяваннем. І вельмі прыемным падарункам для людзей стала адкрыццё ў мікрараёне Казіміраўка Магілёва доўгачаканага дзіцячага садка на 240 месцаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

# Як дабіцца парадку на зямлі?

**У пошуку адказаў на гэта сакральнае для беларусаў пытанне мы звярнуліся да людзей, у чые абавязкі і ўваходзіць добраўпарадкаванне тэрыторый.**

**Старшыня Дзятлаўскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр БАРАНОЎСКІ:**

— Трэба зрабіць так, каб не было закінутых зямель і ўчасткаў. Не павінна быць паламаных платоў і дрэў, пакінутых дамоў. Гэта прапісныя ісціны, але займацца гэтым трэба пастаянна. Гэта датычыцца таксама і прыпынachных пунктаў — і не некаторых, а ўсіх, нават самых маленькіх і аддаленых. На самай справе, парадак — гэта шырокае паняцце, куды ўваходзіць мноства аб'ектаў. Вядома, гэта і могілкі. Не думаю, што можна адназначна сказаць — так, у нас наведзены парадак на зямлі. Мы праводзім пастаянны маніторынгі пры ўдзеле розных службаў, а яшчэ дні сельсаветаў. Быў час, што апошняе мерапрыемства праходзіла ў кожным сельсавеце раз у год. Збіралася ўсё начальства, выязджала на дзень і працавала. І нам паказвалі, што адбылося з зямлёй за гэты час. У нас 10 сельсаветаў — і цяпер у нас такі графік: пяць за адзін год. Я лічу, што гэта дзейсная мера.

**Начальнік землеўпарадкавальнай службы Бялыніцкага раённага выканаўчага камітэта Наталля ЛЯЎКОВІЧ:**

— Парадак з пункту гледжання землеўпарадкавання — гэта і рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў, і, калі казаць простай мовай, адсутнасць пустазелля на сельскагаспадарчых землях. І мы кантралюем, каб усё гэта было ў добрым стане. Калі, напрыклад, выдзяляецца ўчастак пад будаўніцтва, то мы сочым за тым, каб яно выконвалася ў названыя тэрміны. Увогуле, гэтае пытанне датычыцца вельмі многіх сфер. Вядома, гэта добраўпарадкаванне розных участкаў, уключэнне невыкарыстоўваемых зямель у сельскагаспадарчы абарот. Бываюць і такія ўчасткі, якія даўно лічацца ў гаспадарках, але яны малапрадукцыйныя і зараслыя. Тады мы шукаем варыянты, як іх правільна выкарыстоўваць. Кропка ў справе навядзення парадку пастаўлена не будзе, таму што гэта працэс, які доўжыцца няспынна. Ёсць штаб па навядзенні парадку, працуюць сельвыканкамы. Функцыя выканкама — больш кантраляваць, а абавязкі землекарыстальнікаў ніхто не адмяняў. Дарэчы, эфектыўны спосаб уплыву — пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**Старшыня Тураўскага гарадскога выканаўчага камітэта Сяргей СКАРАПАЦКІ:**

— Гэта пытанне не аднаго дня. Адказнасць, у першую чаргу, ляжыць на саміх уласніках. Калі б кожны з належнай увагай ставіўся да гэтага пытання, то работы тут было б значна менш для іх службаў. Мы павінны працаваць разам. Ці наведзены парадак у нас? Мы працуем над гэтым, але да дасканаласці нам яшчэ далёка. Самы праблемны момант у навядзенні парадку — гэта пустуючыя хаты. Справа ў тым, што часта спадчыннікі з'язджаюць у розныя краіны, у Расію, напрыклад. І калі цяперашнія ўладальнікі паміраюць, складана адшукаць сваякоў, якія маглі б жыць і прыглядаць за ўчасткам. І мы актыўна вядзём пошукі, хоць гэта і няпроста. Калі мы знаходзім гэтых людзей, то дасылаем ім усе неабходныя дакументы. Ці бывала такое, што нікога не знаходзілі? Так, але толькі адзін раз. Работа вельмі скрупулёзная, цяпер мы сталі знаходзіць сваякоў нават праз сацыяльныя сеткі. Скажам, дзеці гэтых людзей зарэгістраваныя там, мы ім пішам. Вось гэта самая вялікая праблема ў нас, як мне здаецца.

**Старшыня Капыльскага сельскага выканаўчага камітэта Вольга КУПРЫЕНКА:**

— Парадак на зямлі — гэта парадак каля кожнага адміністрацыйнага будынка і землеўладання. Бо зямля бывае розная — каля дома, каля дарогі, землі сельскагаспадарчага прызначэння, тыя ж сметнікі і палігоны. І ўсюды адказныя павінны сачыць за тым, каб на іх тэрыторыі было чыста і прыбрана. За гэта павінен адказваць не толькі выканаўчы камітэт, але і людзі — не кожны паасобку, а ўсе разам.

Я ўвесь час звяртаюся да нашых жыхароў, напрыклад, пры ўборцы могілак — не складвайце тут смецце, выносьце на спецыяльныя пляцоўкі. Бо гэта святое месца, трэба больш паважліва ставіцца. Больш за ўсё патрабаванняў да насельніцтва, таму мы кожны квартал выпускаем спецыяльныя лістоўкі, у якіх заклікаем берагчы зямлю. Дарэчы, у нас праходзяць конкурсы, напрыклад, на самы чысты ўчастак. Ёсць шмат пустуючых зямлі, якую мы стараемся акультурыць. Нешта засаджваем дрэвамі, калі ўчастак наогул ніяк нельга выкарыстоўваць. Пытанняў па гэтай тэме вельмі шмат, але ўсё паступова вырашаецца. Не магу сказаць, што ў нас ужо наведзены парадак, таму што гэта бесперапынны працэс. Мы імкнёмся да гэтага, таму вядзём планавую, пастаянную работу.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

# ПУСТЫЯ ДАМЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*

У рашэнні праблемы старых і пакінутых дамоў сапраўды ёсць пэўныя складанасці. У першую чаргу яны звязаны з пошукам спадчыннікаў. Патэнцыйныя ўладальнікі часта жывуць за мяжой, і знайсці іх часам вельмі няпроста. Ёсць і іншыя моманты. Многія наўмысна не ўступаюць у спадчыну, каб не плаціць падатак на зямлю і нерухомасць.

## ТРЫ АСНОЎНЫЯ БЛОКІ

У нашай краіне літаральна з 2006 года дзейнічае адзіны парадак уліку старых і пустуючых дамоў. Апошні раз ён карэктаваўся 5 гадоў таму Указам №100, які распаўсюджваецца толькі на сельскую мясцовасць і гарады раённага падпарадкавання. «З улікам прапаноў з месцаў і аналізу практыкі прымянення ўказа, у новым праекце прапануецца распаўсюдзіць яго дзеянне на ўсю тэрыторыю — Мінск, абласныя цэнтры і іншыя буйныя гарады. Праект — гэта новы крок, у ім ідзе гаворка аб трох прынцыповых блоках



пытанняў», — тлумачыць Андрэй Гаеў.

Першы блок пытанняў нацэлены менавіта на распаўсюджванне ўказа на ўсю тэрыторыю краіны. Другі момант. Цяпер рэгістр пустуючых дамоў вядзецца ў папяровым выглядзе, а ў дачыненні да старых дамоў такі рэсурс не вядзецца. Прапануецца ўніфікаваць падыход і ажыццяўляць улік і старых, і пустых дамоў у адпаведных рэгістрах у электронным выглядзе. Гэта паменшыць папяровую работу і спросціць абмен інфармацыяй паміж выканкамамі. Трэці блок пытанняў датычыцца парадку продажу і ўдасканалення залучэння аб'ектаў у гаспадарчы абарот. Практыка паказвае: пустуючыя хаты ў асноўным зносяцца. Так, за апошнія пяць гадоў больш за 47 тысяч такіх дамоў знесена і толькі 355 прададзена.

## РАЗВАРУШЫЦЬ ПРОДАЖ

Што ў гэтым кірунку робіцца? З'явіцца магчымасць продажу названых аб'ектаў не толькі на аўкцыёнах, але і наўпрост. Аднак гэтае правіла не будзе распаўсюджвацца на Мінск, абласныя цэнтры і іншыя населеныя пункты, якія вызначаць самі выканкамы, улічваючы попыт. Для таго каб не было ніякіх негатыўных момантаў, працэдура продажу арганізавана максімальна празрыста: інфармацыя аб продажы аб'ектаў будзе размяшчацца на сайтах выканкамаў, у СМІ. Калі за месяц, напрыклад, паступіць адна заява — адбудзецца прамы продаж. Дзве і больш — арганізуюць таргі. Калі таргі не дадуць ніякага выніку, будзе дазволена паніжаць першапачатковы кошт да 80%.

## ЗА КОШТ НОВАГА КАРЫСТАЛЬНІКА

Што датычыцца дамоў, якія неабходна зносіць. Сёння гэта робіцца за кошт выканкамаў. Каб паменшыць гэтыя выдаткі, даецца магчымасць перадаваць ва ўстаноўленым парадку зямельныя ўчасткі з умовай зносу трухлявага або пустога дома новым землекарыстальнікам. З'яўляюцца і некаторыя змены, якія тычацца так званай вымарачнай спадчыны. Калі ўласнік жылога дома памірае і не застаецца спадчыннікаў ні па законе, ні па завяшчанні, то такая маёмасць пераходзіць ва ўласнасць адміністрацыйнай тэрытарыяльнай адзінкі. Тут таксама ўзнікае пытанне: як далей з гэтай маёмасцю быць? Па просьбе выканкамаў прапануецца парадак дзеяння ўказа распаўсюдзіць і на такія аб'екты.

**Сяргей КУРКАЧ.**
kurkach@zviazda.by

**У ТЭМУ**

**Пустыя хаты не проста выглядаюць непрывабна. У іх часта ўзнікаюць пажары, а таксама іх існаванне ўплывае на сітуацыю з павышэннем узроўню злачыннасці ў вёсках. Больш за палову крадзяжоў у сельскай мясцовасці адбываецца менавіта ў пустых дамах.**

АКТУАЛЬНА

# ЯК «РУХАЕЦЦА» НЕРУХОМАСЦЬ?

**На Віцебшчыне з пачатку года правялі каля 460 аўкцыёнаў па продажы аб'ектаў нерухомасці. У выніку «з малатка» пайшлі прыблізна 70 будынкаў і збудаванняў на суму больш за 1 мільён 140 тысяч рублёў.**

## *Навошта інвестару карта?*

Да цікавых вывадаў прыйшлі супрацоўнікі фонду «Віцебскаблмаёмасць».

— На інтарэс інвестара ўплывае не толькі стан будынка, але і яго геаграфічнае размяшчэнне. Больш актыўна прадаюцца дамы і зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца каля гарадоў. Але, канешне, эфектыўнасць угягвання іх у гаспадарчы абарот у многім залежыць ад ініцыятывы мясцовай улады, — расказвае **Вольга ЮШКОЎСКАЯ, намеснік начальніка ўпраўлення па распараджэнні дзяржмаёмасцю.**

Станоўчых прыкладаў нямала. У вёсцы Гараднянскі Мох Віцебскага раёна прыватнік выкупіў пустуючы адміністрацыйны будынак і адкрыў краму. Набываюцца незапатрабаваныя будынкі ў маланаселеных вёсках і пад арганізацыю больш сур'ёзных праектаў. Прадпрымальныя людзі асвойваюць нішы, якія, на першы погляд, не вельмі ўласцівыя паўночнаму рэгіёну. Узяць хоць бы прадпрыемства «Майстар-грыб». Яно спецыялізуецца на вырошчванні шампіньёнаў.

— Піянеры грыбнога бізнесу у вобласці арганізавалі справу ў вёсцы Васількі Віцебскага раёна — у будынках былога зерняскладa, — тлумачыць супрацоўнік фонду.

## *Элітныя свяцільні*

Зразумела, што пустуючыя будынкі карыстаюцца попытам і ў рэгіёнах з багатым прыродным патэнцыялам, перспектывамі развіцця турызму. Сярод такіх Браслаўшчына, Глыбоччына.


Гатэль у Глыбокім.

У прыватнасці, доўгі час у Глыбокім нікому не быў неабходны адміністрацыйны будынак «Сельгастэхнікі». Цяпер яго не пазнаць. Прыватная кампанія ўклала сродкі ў рамонт і арганізавала камфартабельную гасцініцу. Там спыняецца нямала турыстаў.

Цікавую вытворчасць арганізавалі ў Паставах у будынках, якія таксама доўгі час не выкарыстоўваліся. Іх купілі на аўкцыёне з паніжэннем пачатковай цаны на 80%. Там прыкладна год таму таварыства з абмежаванай адказнасцю наладзіла выраб настольных свяцільняў. Для арганізацыі вытворчасці набылі абсталяванне за 70,4 тысячы рублёў. Стварылі чатыры рабочыя месцы. Электрапрыборы робяць з розных парод драўніны: дуба, бука, хвоі. Прадукцыя экспартуецца ў Расію. Ужо зрабілі больш за 630 свяцільняў агульным коштам 23,9 тысячы долараў.

## *Школы пад жыллё*

Таксама ў Паставах некалькі гадоў таму на аналагічных умовах індывідуальны прадпрымальнік набыў будынак канторы з прыбудовай. І сёння замест аб'екта, які не выкарыстоўваўся, можна ўбачыць прыгожы гандлёвы аб'ект. На першым паверсе — крама па продажы мэблі, а на другім, які надбудавалі, — більярдная зала. На рэканструкцыю патрацілі больш за 10 тысяч рублёў. Работу атрымалі восем мясцовых жыхароў.

Цікавай тэндэнцыяй апошніх гадоў стаў інтарэс грамадзян да набыцця пад жыллё закрытых школ, іншых будынкаў у сельскай мясцовасці.

— Права набываць на аўкцыёнах нерухомасць для выкарыстання ў якасці жылых памяшканняў або вядзення падсобнай гаспадаркі прадастаўлена ў сярэдзіне 2012 года. Гэта было зроблена ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта (№294). Але толькі пры ўмове, калі аб'ектам не зацікавіліся інвестары для арганізацыі вытворчасці. Новыя ўладальнікі абавязваюцца ў канкрэтныя тэрміны акультурыць участак і абжыцца на новым месцы, — канстатаваў Міхаіл Паўлючкоў, старшыня фонду «Віцебскаблмаёмасць».

Уся інфармацыя для патэнцыйных інвестараў, у тым ліку аб нарматыўнай базе, ёсць на сайце фонду. Неабходныя звесткі можна знайсці і на сайтах органаў дзяржаўнага кіравання.

На лістапад-снежань фонд прызначыў больш за 100 аўкцыёнаў. Па некаторых аб'ектах пачатковая цана продажу зніжаная на 20, 50 і нават 80%. Ёсць аб'екты, якія можна набыць усяго за адну базавую велічыню.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
pukshanski@zviazda.by

СІТУАЦЫЯ

# НІЧЫЙНЫЯ СОТКІ?

**Народныя абраннікі Магілёўскай вобласці — пра недахопы зямельнага заканадаўства**

**З мэтай навядзення парадку і скарачэння колькасці пустуючых дамоў у сельскай мясцовасці некалькі гадоў таму быў падпісаны Указ №100. Але пытанні ўсё роўна засталіся. Дэпутаты-практыкі ў адзін голас заяўляюць: заканадаўства абавязкова павінна агаварыць тэрмін іскавай даўніны ўступлення нашчадкаў у спадчыну. Прычым не толькі ва Указе, але і ў Грамадзянскім кодэксе, дзе гэты тэрмін таксама не вызначаны. Зараз працэс уступлення ў правы валодання нерухомасцю на правах уласніка расцягваецца на дзесяцігоддзі. І стаяць дамы самі па сабе, без гаспадароў. Калі што — і спытаць няма з каго... Дэпутаты Магілёўскай вобласці дзеляцца меркаваннямі наконт таго, што трэба зрабіць, каб удасканаліць работу з навядзеннем парадку на зямлі.**

## Сляды згубіліся ў часе

Па выніках мінулага года Добраўскі сельсавет Горацкага раёна быў прызнаны найлепшым у намінацыі рэспубліканскага агляду-конкурсу «Землекарыстанне высокай культуры земляробства, добраўпарадкаванне машынных двароў, жывёлагадоўчых ферм і комплексаў». У Клічаве на абласным фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2017» **старшыні сельскага Савета Уладзіміру ЦЕРБАВУ** уручылі дыплом і падарунак — трактар «Беларус 82.1». «Тут менавіта ўлічвалася ўсё, звязанае з навядзеннем парадку на зямлі», — падкрэслівае старшыня. Папрацаваць прыйшлося ўдарна. Шмат было знесена старых дамоў, фундаментаў, прыбрана закінутых садоў. Асабіста Уладзімір Цербаў удзячны за дапамогу Віталію Секушэнку, дырэктару Горацкай райаграпрамтэхнікі. Уключаныя ў севазварот землі ўзараны, і ўжо атрыманы першыя ўраджаі проса і кукурузы. Вельмі дапамог аграном вытворчага ўчастка «Добрае» Андрэй Махрачоў, таксама дэпутат Добраўскага сельскага Савета. Старшыня папрасіў падзякаваць і жыхарам аграгарадка Добрае, якія актыўна ўпрыгожвалі асабістыя сядзібы і тэрыторыю вакол іх, дапамагалі рыхтаваць населены пункт да раённых «Дажынак».

> «Чалавек карыстаецца домам, але ў спадчыну не ўступае. Тэрміну іскавай даўнасці няма, вось і атрымліваецца, што ён спадчыннік, але не ўладальнік. А значыць, на яго адміністрацыйна і не паўплываеш».

Наводзіць парадак на зямлі заўсёды няпроста, лічыць мой суразмоўнік. Не хапае грошай, спецыялізаванага транспарту, паўнамоцтваў.

— Дзякуючы Указу №100 за апошнія тры гады ў 11 населеных пунктах з 17 існуючых на тэрыторыі сельсавета навялі парадак, — кажа Уладзімір Цербаў. — Адзінае, што перашкаджае рабоце, — адсутнасць тэрміну даўніны па ўступленні ў спадчыну. Калі чалавек добрасумленны, з ім можна дамовіцца, але ж людзі бываюць розныя. Некаторыя не ўступаюць у свае правы на домаўладанне і 30 гадоў! І мы нічога не можам зрабіць. Калі вырашаць пытанне праз суд, то трэба ставіць дом на баланс, рабіць праектна-каштарысную дакументацыю, якая каштуе шмат грошай, і выстаўляць яго на аўкцыён. Але трухлявыя разваліны попытам не карыстаюцца.

У Кіраўскім раёне за 10 месяцаў з пачатку года было знесена 114 пустуючых дамоў. Усяго ж выяўлены 261. З іх 85 хат знаходзіцца ў карыстанні так званых неафіцыйных спадчыннікаў, якія не афармілі свае правы. І тут таксама ёсць пытанні да некаторых пунктаў згаданага Указа. Напрыклад, да 3-га, дзе агаворваецца патрабаванне да ўласнікаў, якія на працягу 3 гадоў павінны паведаміць у сельвыканкам па месцы знаходжання жылога дома пра намер у ім пражываць.

У раённым Савеце дэпутатаў звяртаюць увагу на тое, што ўласнікі і не думаюць самастойна да іх звяртацца. Прыходзіцца самім пісаць ім лісты, каб даведацца, што яны наогул збіраюцца рабіць з домам. А пазбавіць уласніка гэтай нерухомасці толькі за тое, што ён ігнаруе «соты» Указ, суды не могуць. Патрэбны больш важкі аргумент. Перш за ўсё пісьмовая адмова ад уладання домам. А бывае, што ўласнік памёр, а нашчадкаў яшчэ паспрабуй знайсці. Раней у сем'ях было не па 1—2 дзіцяці, як зараз, а па тры і болей. Разляцеліся хто куды. А дом, пакуль ідуць пошукі, занепадае, прыходзіцца наводзіць парадак за дзяржаўны кошт.

У пункце 4 агаворваецца: калі камісіяй па абследаванні дома выяўлена, што ён пустуе, трэба прыкласці намаганні, каб знайсці ўласніка або яго нашчадкаў. На справе, калі ўласнік памёр, а нашчадкі памянялі адрас, прозвішча, краіну, пошукі расцягваюцца ў часе. Не зразумела таксама, якая менавіта камісія павінна прызнаць дом струхнелым. Ёсць неразуменне і ў адносінах да пункта 10, дзе гаворыцца, што драхлы дом або фундамент ад яго можна знесці са згоды ўласніка. Але дзе знайсці ўласніка, калі дом быў пабудаваны яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя? Тады яшчэ нават не было ні назваў вуліц, ні нумарацыі пабудоў. Ды і сляды нашчадкаў ужо згубіліся ў часе. Пакуль усе гэтыя пытанні застаюцца адкрытымі.

## Міна запаволенага дзеяння

Нехта скажа, што негуманна пазбаўляць чалавека права на яго спадчыну. Але ж чаму нехта павінен несці на гэтым страты? У любой маёмасці павінен быць гаспадар — адказваць за яе, даглядаць. На справе звычайна адбываецца так: гаспадары памерлі, а нашчадкі не спяшаюцца ўступаць у законныя правы. Абяцаюць, што праз пару гадоў выйдуць на пенсію, пераедуць у вёску і абавязкова прывядуць дом у цывілізаваны выгляд. Праходзіць год, два, пяць, але ніхто не прыязджае. Дом стамляецца чакаць і прыходзіць у заняпад...

— Па «сотым» Указе наогул шмат пытанняў. І я пра гэта колькі разоў пісаў нашым сенатарам, — кажа **старшыня Бабруйскага райсавета дэпутатаў Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ.** — Чалавек карыстаецца домам, але ў спадчыну не ўступае. А значыць, на яго адміністрацыйна і не паўплываеш. А за тое, што там зарастае, спаганяюць са старшыні сельскага Савета. Санстанцыя прыехала і аштрафавала яго. І на судзе нічога не дакажаш. Гора-гаспадар знойдзе сведак, якія за паўлітра пацвердзяць, што ён перыядычна прыязджае. Быў у нас такі выпадак у Кавалёўскім сельсавеце.

— Падчас аптымізацыі да нас далучылі 27 вёсак, у некаторых з іх да 10 пустуючых дамоў, — працягвае размову **старшыня Глушанскага сельскага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна Марыя СУШЧАНКА.** — Уяўляеце, колькі павінна адбыцца судовых пасяджэнняў, каб іх афіцыйна прызналі такімі? Дамы атрымліваем фактычна ў стадыі трухлявасці. Гэта як міна запаволенага дзеяння. Ніколі не ведаеш, калі і дзе ўзарвецца. Яны быццам магнітам прыцягваюць асацыяльных і крымінальных асоб. Калі мы хочам, каб быў парадак, трэба ўносіць яснасць у заканадаўства, вызначыцца, на працягу якога часу чалавек павінен уступіць у спадчыну. Тэрмін павінен быць разумны — год, максімум два. Уважлівая прычына адтэрміноўкі — толькі хвароба або турма. А ўсё астатняе — гэта не прычына.



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА

> Нават калі чалавек выязджае далёка, ён можа пакінуць даверанасць. А то мы самі сябе ж абкрадваем. Людзі гадамі не ўступаюць у правы спадчыннікаў, а выдаткі нясе дзяржава. Ва Указе №100 увесь час ідзе размова пра ўласнікаў. Але ж часцей за ўсё праблемы ўзнікаюць тады, калі тыя паміраюць і на гарызонце з'яўляюцца нашчадкі.

## Трэба ўносіць праўкі ў Грамадзянскі кодэкс

У прыватнай гутарцы дэпутаты часта даюць волю эмоцыям, але папярэджваюць: гэта не для друку. Бо часцей за ўсё проста закрываюць вочы на ўсе гэтыя супярэчнасці і імкнуцца дагаварыцца з людзьмі. Самы прымальны варыянт, калі чалавек пагаджаецца, што яго спадчына каштоўнасці не ўяўляе, і піша ў сельсавет заяву з просьбай дапамагчы знесці хату. Некаторыя жыхары пасля прафілактычнай размовы самі разбіраюць свае халупы або аддаюць суседзям на дровы. Але самыя «разумныя» грамадзяне прынцыпова не афармляюць спадчыну гадамі — чакаюць сустрэчы ў судзе, каб атрымаць кампенсацыю за знос. Пакупнікам гэтая маёмасць і дарма не патрэбна, а вось з дзяржавай можна і ў гульні пагуляць. Закон, маўляў, не забараняе.

> І нават калі суд прымае рашэнне не на карысць спадчынніка, радасці сельсаветам ніякай. Гэта значыць — узяць на сябе ўстанаўленне меж зямельнага ўчастка, выраб тэхнічнага пашпарта, рэгістрацыю дома, ад якога часта застаюцца адны толькі сцены. У сельсавеце няма лішніх грошай, каб рабіць усё гэта, тым больш на завядзенне дама нікому не патрэбны аб'ект. Ды і з аўкцыёну яго ніхто не купіць. Нават у якасці дроў.

Устанаўленне тэрмінаў іскавай даўнасці на спадчыну — гэта не чыйсьці капрыз, а жаданне зэканоміць бюджэтныя сродкі, сведчаць дэпутаты. Прычым адным Указам №100 справа не абмяжоўваецца.

— Сёння ён ідзе ўразрэз з Грамадзянскім кодэксам у адносінах да права на спадчыну, — звяртаюць увагу дэпутаты. — Таму і суды не могуць прыняць рашэнне аб прызнанні дома пустуючым. Грамадзянскі кодэкс канкрэтна не агаворвае тэрмін уступлення нашчадкаў у спадчыну. Таму перш за ўсё неабходна ўнесці змены ў Кодэкс.

## ... і ў Зямельны

Па Зямельным кодэксе таксама ёсць пытанні, сігналізуюць народныя абраннікі. А ад гэтага залежыць парадак на сельскіх тэрыторыях.

— Сёння, калі чалавек уступае ў спадчыну, ён мае права толькі на 25 «сотак». А яго бацькі, напрыклад, мелі іх 35, — кажа Марыя Сушчанка. — Можна, вядома, лішнія «соткі» ўзяць пад асабістую падсобную гаспадарку, але афармленне каштуе 400 рублёў. Дачнікам гэта наогул не трэба. У выніку на тэрыторыі застаюцца так званыя апендыксы. Мы даглядаем іх, але, па сутнасці, марнуем дзяржаўныя грошы. І нічога зрабіць нельга.

> Зямельны кодэкс аднолькавы хоць для Мінска, хоць для сельскай мясцовасці. Хаця для такіх рэгіёнаў, дзе зямля не аўкцыённая, не запатрабаваная, няма неабходнасці рэгламентаваць заканадаўствам гэтыя 25 «сотак». Чаму нельга даць магчымасць мясцовым уладам самастойна вырашаць «зямельнае» пытанне?

Калі чалавек уступае ў спадчыну, хай ён гэту зямлю і забірае незалежна ад таго, колькі яе знаходзіцца ва ўладанні. Гэта ж дадатковыя падаткі! Замест гэтага сёння ўтварылася шмат пустуючых тэрыторый, якія немагчыма ўцягнуць у севазварот. Побач лясы, рэкі — тэхніка там не пройдзе.

Яшчэ адзін спрэчны момант. У шматкватэрных дамах з ізаляванымі ўваходамі (ёсць такія ў сельскай мясцовасці) таксама зямля «прывязваецца» да долі маёмасці. А гэтага, лічаць дэпутаты, рабіць не трэба. Афармляць неабходна не па долях, а па фактычным выкарыстанні. Людзі павінны самі дагаворвацца. А калі пачынаюць дзяліць зямлю на долі, суседзі не могуць дасягнуць узаемнай згоды.

— Вось у нас дамы барачнага тыпу — раней людзі там карысталіся надзеламі так, як калісьці дамовіліся паміж сабой іх бацькі, — кажа суразмоўнік. — А калі сталі дзяліць зямлю ў долях кватэр, пачаліся рознагалоссі. І пайшлі суды, выдаткі. Гэта на сённяшні дзень самыя цяжкія судовыя працэсы. Я абмяркоўвала пытанне з калегамі з іншых абласцей, і яны таксама пацвярджаюць: калі пачынаюцца спрэчкі — дзе якую агароджу паставіць, дзе які праезд зрабіць, ідзе сапраўдная вайна. І шмат хто вакое не дзеля зямлі, а з прынцыпу. У мяне быў выпадак, калі людзі дзялілі долю ў долі і за 18 гадоў супрацьстаяння так і не дасягнулі згоды. Яны ўжо памерлі, але меж у падзеле зямельнага ўчастка так і не ўстанавілі...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

У ДОБРЫЯ РУКІ

# ІНВЕСТАР СТАЎ РАЗБОРЛІВЫ,

## або Чаму пустыя будынкі ў Гродзенскай вобласці прадаюцца марудна

**ЭКСПЕРТЫ лічаць — пік попыту на аб'екты нерухомасці будзе назірацца пад канец года, калі ёсць верагоднасць зніжэння кошту да адной базавай велічыні. Іх апаненты, наадварот, упэўнены, што катэгорыя «азартных гульцоў» адпала, а пакупнікі ўзважваюць рызыкі і магчымасці.**



Будынак былой Медыцынскай акадэміі чакае гаспадара.

### Ахвотныя ёсць

Сёлета запланавана ўвесці ў гаспадарчы абарот каля 100 пустуючых аб'ектаў, канстатуюць спецыялісты фонду «Гроднааблмаёмасць». З пачатку года ў вобласці праведзена 125 аўкцыёнаў. Але вынікі не ўражваюць. Сёлета ўдалося прадаць толькі 17 аб'ектаў з графіка гэтага года і яшчэ 16 — з мінулых гадоў. Такім чынам, у гаспадарчы абарот пакуль уцягнута трэцяя частка запланаванага. Чаму не ўдаецца выканаць план? **Начальнік аддзела фонду «Гроднааблмаёмасць» Святлана ЛЕНДЗІНА** лічыць, што патэнцыяльныя пакупнікі чакаюць канца года, калі аб'екты будуць выстаўляцца па мінімальнай цане — за адну базавую велічыню.



Былая пральня — цяпер тут размясцілася прыватная друкарня.

Шэраг аб'ектаў сапраўды набыты за мінімальную ці значна зніжаную цану. Часцей за ўсё за адну базавую прадаюцца будынкі былых ваенных гарадкоў. У адным з такіх аб'ектаў прадпрымальнік плануе адкрыць кафэ ў зоне Аўгустоўскага канала. Былую школу набыла ў Шчучынскім раёне аматар іпатэрапіі. Жанчына плануе стварыць аздараўленчую конную базу для заняткаў з дзецьмі. Другое жыццё атрымаў былы кансервавы завод у Іўі. На яго базе з'явіўся філіял прадпрыемства «Лідатэхмаш», па сутнасці новы завод па выпуску сельскагаспадарчых машын. Створана 150 працоўных месцаў. За адну базавую велічыню прададзена ў Ваўкавыскім раёне кацельная, якая будзе выкарыстоўвацца па сваім прызначэнні — побач з цеплавым вузлом размешчаны вытворчыя плошчы мясцовага прадпрымальніка.

У Гродзенскім гарвыканкаме назвалі шэраг адрасоў, дзе інвестары літаральна адрадзілі будынкі. Поўнасцю адрамантавана былая пральня — цяпер тут размясціліся дзве прыватныя друкарні. Вялікія плошчы дзіцячага садка, што быў на балансе тытунёвай фабрыкі, пераўтварылі ў сучасны стыльны бізнес-цэнтр. Тут размешчаны офісы і крамы амаль 40 арандатараў.

### Узважаны разлік

**Здаецца, аб'екты прадаюцца, і гэта добра. Але ёсць у згаданай справе і адваротны бок. Не заўсёды іх набываюць сапраўдныя гаспадары. Напрыклад, у Шчучынскім раёне толькі сёлета вернута ў камунальную маёмасць ажно 11 аб'ектаў. Прадпрымальнікі набылі іх за адну базавую, але не здолелі ўцягнуць у гаспадарчы абарот. Па рашэнні суда будынкі ў іх канфіскаваны.**

У тэорыі мінімальны кошт павінен садзейнічаць попыту. І спачатку так і сталася. З'явілася нямала ахвотных набыць амаль задарма нядрэнны будынак, адзначаюць у аддзеле эканомікі Шчучынскага райвыканкама. Але кожны выканаў дагаворныя абавязацельствы. Бо аб'ект павінен быць задзейнічаны на працягу двух гадоў, а яшчэ на працягу пяці трэба прытрымлівацца дагавора па яго прызначэнні. Такія ўмовы не кожнаму падыходзяць. Таму зараз больш прывабнымі здаюцца аб'екты, якія не звязаны такімі абавязацельствамі, хоць і каштуюць даражэй.

Катэгорыя «азартных гульцоў» адпала, кажуць спецыялісты райвыканкама. З'явіўся новы тып прадпрымальніка. Перш чым увязацца ў «бойку», яны пралічваюць рызыкі, вывучаюць маштаб работы, свае магчымасці. Прыняўшы рашэнне, упарта ідуць да сваёй мэты. Такіх прыкладаў нямала. У Шчучынскім раёне на аўкцыёне за адну базавую велічыню выстаўляўся будынак былога дзіцячага садка. З'явілася некалькі прэтэндэнтаў, у выніку паміж імі пачаўся гандаль, і аб'ект быў прададзены за 6 тыс. рублёў. Але мясцовы прадпрымальнік пайшоў на такую пераплату, бо ведаў, чаго дабіваецца — у былым садку ён мае намер уладкаваць агратурыстычны комплекс.



Прадаецца гістарычны аб'ект у цэнтры Гродна.

### Набылі кінатэатр

**Некаторыя аб'екты знаходзяць пакупнікоў адразу, як толькі выстаўляюцца на аўкцыён. Так, у Лідзе фермер купіў за поўны кошт гаражы, якія плануе выкарыстаць пад склады. У Ашмянах на першым жа аўкцыёне пайшла «з малатка» былая друкарня. Аналагічна прададзены фізічнай асобе за 46 тыс. рублёў адміністрацыйны будынак у Дзятлаве.**

На продаж выстаўляюцца самыя разнастайныя будынкі. У Слоніме за палову першапачатковага кошту — 35 тыс. рублёў — фірма выкупіла нават кінатэатр і, што самае цікавае, гэты кірунак збіраецца працягваць. Шыць бялізну плануюць уласнікі майстэрняў у Смаргоні — аб'ект выкупілі за паўцаны. А вось гродзенскі прадпрымальнік сёлета набыў за 17,5 тыс. рублёў былую воданапорную вежу ў гарадскім лесапарку. Мяркуецца, што там можа быць адкрыта кафэ.

У Шчучыне працягваецца продаж былых ваенных аб'ектаў. Некалі іх тут былі сотні. За 10 гадоў значная частка знайшла новых уласнікаў. Вось і сёлета мясцовы прадпрымальнік купіў за 15 тыс. рублёў ангар, дзе размесціць вытворчасць гафрыраваных труб. Разам з тым, маштабнасці ў гэтым працэсе не назіраецца, кажуць спецыялісты. Аб чым сведчаць і лічбы. Сёлета ў раёне з 25 аб'ектаў прададзена толькі шэсць. Пустуючыя аб'екты ў асноўным набываюць жыхары свайго раёна, чым у райвыканкаме задаволены. «Свае» больш адказныя за справу. І мясцовым уладам ёсць што ім прапанаваць. Напрыклад, на чарговы аўкцыён будуць выстаўлены ангар і сховішча былога ваеннага гарадка, будынак дыспетчарскай і сельскі Дом культуры.

### Замежнікі цікавяцца таксама

У рэгіёне не супраць замежных інвестараў. Вось толькі не заўсёды яны даводзяць справу да канца. Так адбылося з палацам графа Умястоўскага ў Іўеўскім раёне. Два гады таму сядзібу набыў грамадзянін Іарданіі, каб развіваць турыстычныя паслугі. Але неўзабаве інвестар знік, хоць і заплаціў, згодна з умовамі аўкцыёну, частку кошту. Калі ўсе тэрміны выйшлі, дагавор з ім быў скасаваны. Між тым палац аказаўся запатрабаваным у беларусаў, і сёлета яго купіла сталічнае прыватнае прадпрыемства.

Трэба сказаць, што замежныя грамадзяне цікавяцца маёмасцю ў рэгіёне. Як правіла, гэта нашчадкі жыхароў Гродзеншчыны. У фондзе «Гроднааблмаёмасць» расказалі, што ўраджэнка Бераставіцкага раёна, якая зараз жыве ў Германіі, мае намер купіць былую школу. Жанчына плануе адкрыць тут кафэ і гасцініцу. Пры гэтым частку школы яна хоча абсталяваць пад мастацкую студыю, бо яе вельмі ўразіла, што бацькі возяць сваіх дзяцей на заняткі ў Гродна. Дарэчы, школа прадаецца за 17 тыс. рублёў — кошт паніжаны на 80%.

**Выклікае цікавасць у замежных інвестараў і гістарычны будынак былой Медыцынскай акадэміі XVIII стагоддзя. Аб гэтым паведаміла жыхарка абласнога цэнтра, чые родныя жывуць у Францыі і сочаць за продажам аб'ектаў у Гродне. Быў палац прадаецца не першы год. На наступным аўкцыёне будзе выстаўляцца за 50% кошту, але цана застаецца высокай — 2 млн рублёў.**

Ацэнку праводзіць Міністэрства культуры, таму што аб'ект лічыцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю, а да гэтага тут размяшчалася ваенная камендатура. Пакупнікоў на яго не знаходзіцца ўжо тры гады.

### Стаўка на турызм

Продаж гістарычных аб'ектаў ідзе марудна. Прычына вядомая — інвестару працей купіць участак і будавацца, чым атрымаць стары будынак з шэрагам узгадненняў і абавязацельстваў. У Гродзенскім гарвыканкаме тым не менш запэўнілі, што ў гаспадарчы абарот за апошнія два гады ўцягнуты не адзін дзясятак будынкаў гістарычнага цэнтра. Маштабныя работы вядуць уласнікі па вуліцы Траецкай. Што там будзе, пакуль невядома. Інвестары, зразумела, кіруюцца попытам. Апошнім часам актывізаваўся сэрвіс — адкрываюцца кафэ і гасцініцы. Станоўчую ролю адыграла бязвізавая зона з турыстычным патокам.

У фондзе «Гроднааблмаёмасць» лічаць, што менавіта развіццё турызму можа павысіць попыт на пустуючыя аб'екты. Асабліва на тыя, што выйшлі з абароту нядаўна, як, напрыклад, дзве школы ў Гродзенскім раёне. На найбліжэйшым аўкцыёне яны ідуць са зніжкай на 80%. Пры гэтым кошт адной складае 34 тыс., другой — 77 тыс. рублёў. Спецыялісты кажуць, што аб'екты якраз падыходзяць для турыстычных мэт, бо знаходзяцца ў бязвізавай зоне Аўгустоўскага парку. Дарэчы, у вёсцы, дзе знаходзіцца школа, прадпрымальнік ужо выкупіў былы клуб і цяпер вядзе там рамонтныя работы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
margo@zviazda.by

ХУТКАЯ ДАПАМОГА

# БУДНІ ВЯСКОВАГА ФЕЛЬЧАРА

## У фельчарска-акушэрскі пункт пацыенты ідуць не толькі лячыцца, але і адвесці душу

**Як жывуць сельскія медыкі, якія праблемы іх хвалююць, чым адрозніваецца іх работа ад работы гарадскіх калег, высвятляла карэспандэнт «Мясцовага самакіравання». Для гэтага яна накіравалася ў вёску Мятлічыцы Лагойскага раёна.**

Фельчарска-акушэрскі пункт месціцца ў жывапісным месцы паміж двума населенымі пунктамі — Мятлічыцы і Акалова. Гэты дыхтоўны прыгожы будынак у выглядзе літары П узвёў у 90-я гады мінулага стагоддзя мясцовы калгас.

— Мы абслугоўваем 29 вёсак сельсавета, у якіх пражываюць 1088 чалавек, — расказала фельчар Вольга Пятроўская, на якую адначасова ўскладзены і абавязкі матэрыяльна адказнай. — Калектыў наш невялікі — участковая акушэрка Аліна Косач, фізіямедсястра Галіна Ціхановіч, санітарка Ганна Сівец, вадзіцель Генадзь Шыла. Усе вельмі адказныя людзі, прафесіяналы высокага класа, маюць катэгорыі, раз у пяць гадоў праходзяць курсы перападрыхтоўкі, здаюць залікі. Усе валодаюць асновамі рэанімацыі. Калектыў у нас дружны, умеюць і працаваць, і адпачываць.

Нядаўна Вользе Анатольеўне споўнілася 50 гадоў. У той дзень яе выклікалі да хворых. І, вядома, было не да святкавання. Але жанчына бачыла, што калегі нешта рыхтуюць, таямніча шэпчуцца, пераглядваюцца. І вельмі расчулілася, калі ўсім калектывам яе не проста павіншавалі, але арганізавалі канцэртную праграму.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Ніколі не забуду гэты душэўны падарунак», — кажа мая суразмоўніца.

Але святы здараюцца не так часта. У асноўным — будні. Бывае, звяртаюцца па дапамогу два-тры пацыенты, а калі і больш за дзесяць — дзень на дзень не прыходзіцца. Найбольш прыходзяць памераць крывяны ціск, зрабіць уколы. У фельчарска-акушэрскім пункце ёсць стацыянарнае аддзяленне на чатыры месцы. Яно не пустуе. Сюды, як правіла, днём кладуць пацыентаў, якім урачы Плешчаніцкай паліклінікі прапісалі розныя працэдуры.

— Сапраўды, у нас шмат такіх. Камусьці патрабуецца крапельніца, іншаму — ін'екцыя, а камусьці цепла-, электра-, ультрагукавыя, лазерныя працэдуры, інгаляцыя, — канстатуе медсястра Галіна Ціхановіч. — У нас ёсць для гэтага ўся неабходная апаратура. Ды і хворым не трэба дабірацца да Плешчаніц, чакаць прыёму ў чарзе. Курс прызначанага лячэння яны праходзяць на месцы. Вельмі зручна.

Але, канешне, з цягам часу медыцынскае абсталяванне старэе, зношваецца. І мясцовым медыкам, вядома, хочацца больш новага, сучаснага. Хоць, як прызналася Вольга Анатольеўна, апошнім часам ва ўстанове адбылося нямала станоўчых зрухаў, дзякуючы дапамозе Лагойскай цэнтральнай раённай бальніцы. Летась паставілі бойлер для падагрэву вады, гарачай вадой аснашчаюцца іншыя кабінеты. Закупілі таксама новыя камп'ютары, якія засталося толькі падключыць. Гэта значна аблегчыць працу медыкаў, паколькі ўся інфармацыя на кожнага пацыента будзе захоўвацца ў электронным варыянце. У ФАПе працягваецца рамонт памяшканняў за сродкі раённай ЦРБ. Шмат ужо зроблена. Абнавіўся прывівачны кабінет, які цалкам апрацоўваецца кварцавымі лямпамі. Стаматалагічны кабінет абсталяваны ўсім неабходным. Да стаматолага Тамары Мацяйковіч, якая прыязджае ў Мятлічыцы, заўсёды шмат людзей. Вельмі хваляць яе кліенты за ўважлівыя адносіны да кожнага і прафесіяналізм.

Акрамя таго, раз у месяц вядзе прыём урач з суседняй Запольскай амбулаторыі. У Мятлічыцкі ФАП накіроўвалі па размеркаванні маладых спецыялістаў, але пасля абавязковага тэрміну адпрацоўкі яны з'язджалі. Асноўная прычына — у адсутнасці жылля: даводзілася здымаць кватэры. А адзін урач пражываў у Лагойску ў інтэрнаце. Вядома, цяжка было дабірацца да месца працы за многа кіламетраў на грамадскім, спадарожным транспарце.

Сапраўды, сучасная моладзь прывыкла да камфортных умоў працы і пражывання. У сельскіх медыкаў яны не такія, як у горадзе.

Бадай, самая галоўная складанасць для іх — надвор'е. Мароз, дождж, снег — усё роўна трэба ісці па выкліку: хворы чакаць не будзе.

— Нам, вядома, лягчэй, чым нашым калегам з іншых сельскіх ФАПаў — у нас ёсць машына медыцынскай дапамогі. Але здараецца, што не кожны раз транспарт можа даехаць да аддаленай вёскі. То дарогу замяло, то дажджом заліло. Даводзіцца браць у рукі чамаданчык і ісці пяшком, — кажа Вольга Пятроўская.

— І лекамі, відаць, вы горш забяспечаны, чым гарадскія медустановы? — пацікавілася ў Вольгі Анатольеўны.

— Забяспечанасць прэпаратамі ў нас добрая, усе неабходныя атрымліваем па заяўках у раённай бальніцы. Ёсць у нас і аптэчны кіёск, дзе жыхары могуць набыць патрэбныя лякарствы. З раёна штогод прыязджае флюараграфічная лабараторыя. Людзі ахвотна ідуць праверыць свае лёгкія. Між іншым, не трэба траціць час, ехаць спецыяльна ў раённую паліклініку... А ўвогуле, медыцынскіх работнікаў на сяле паважаюць. Тым больш што нас тут добра ведаюць, ды і мы ўсіх ведаем.

Пажылыя кліенты заходзяць не толькі ціск памераць, але пагутарыць па душах: вельмі ж добрыя тут урачы, уважлівыя, заўсёды выслухаюць і дапамогуць.

Медыцынскія работнікі, як і ўсе людзі, таксама хварэюць. Хто ж ім прыходзіць на дапамогу?

— Адзін аднаму ўкольчык зробім, таблетку дадзім — вось і ўсё лячэнне, — смяюцца мае суразмоўніцы. — А калі сур'ёзна, то практычна ва ўсіх нас ёсць хранічныя захворванні. У прыватнасці, алергія на дэзынфіцыруючыя сродкі. Захоўваем усе меры перасцярогі пры рабоце з імі. І хоць яны рэгулярна мяняюцца, прывыканне ўсё роўна ідзе.

Хутка ў медыцынскіх работнікаў, мяркую, клопатаў прыбавіцца. У адным крыле амбулаторыі размесціцца аддзяленне кругласутачнага пражывання для пажылых людзей. І, вядома, знойдуцца такія, хто захоча памераць ціск або проста пагутарыць, адвесці душу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## Пяе акардэон

Іван Засімовіч заняў сёмае месца на сусветным конкурсе баяністаў і акардэаністаў Trophee Mondial de l'Accordeon у Францыі. Аб гэтым паведамляе газета «Янаўскі край» (Іванаўскі раён). Займацца музыкай Іван пачаў з другога класа — пайшоў у дзіцячую школу мастацтваў г. Іванава, дзе яго ўзялі ў клас акардэона. Пасля паступіў у Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы, а потым — у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі. Там ён стаў магістрам. Месяц таму Іван ажыццявіў адну добрую ідэю: ён звязаўся з кіраўніцтвам дзіцячых школ мастацтваў Іванаўскага раёна і прапанаваў правесці майстар-клас для вучняў: «Мне хацелася, каб дзеці на свае вочы ўбачылі, якіх вынікаў можна дасягнуць дзякуючы штодзённай працы і намаганням». Акардэаніст памятае і сваіх педагогаў, якія далі яму пуцёўку ў творчасць: Анатоля Касьяна, Дзмітрыя Стралова, Аляксандра Шувалава.

Пра свой удзел у сусветным спаборніцтве Іван расказвае так: «Седзячы ў самалёце, на шляху ў Францыю, я стараўся расслабіцца і не думаць аб конкурсе. Падчас выступлення на сцэне сусветнага ўзроўню, прэзентуючы журы свае нумары, а гэта New Country (L. Pountie), Armstrong (B. Thiele, GD Weiss, J. Herman, B. Ram) і Mister Clifton (R. Galliano), спаўна адчуў маштабы таго, што адбываецца навокал. Разумеў, якое гэта шчасце — мець магчымасць займацца любімай справай і дзяліцца ёю з навакольнымі».

## Танцавальны настрой

Выпускнікі таленавітага педагога Аляксандры Вашчынчук зараз танцуюць у заслужаным калектыве «Ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя росы», у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры і шмат дзе яшчэ. Сама ж Аляксандра жыве і працуе ў Маларыце. Туды яна пераехала пасля Пінскага вучылішча мастацтваў. «Маларыту я выбрала сама, — расказала харэограф газеце «Голас часу». — Мне прапаноўвалі застацца працаваць у вучылішчы, у харэаграфічнай школе. Аднак незадоўга да размеркавання я пабывала ўпершыню ў Маларыце. Горад мне вельмі спадабаўся сваёй прыгажосцю і цішынёй. Я зразумела, што хачу працаваць менавіта тут. Усе былі вельмі здзіўлены майму выбару».

За пяць гадоў харэограф выхавала маладых танцораў, якія атрымалі больш за 20 дыпломаў пераможцаў і лаўрэатаў абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў.

## Гаворы дакладна

Днямі, у Сусветны дзень лагапедаў, сваё прафесійнае свята адзначала і настаўніца-дэфектолаг вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ясляў-сада №2 г. п. Лоева Святлана Кушнер. Яна вучыць малых правільна вымаўляць гукі ўжо больш за дзесяць гадоў. «Галоўнае ў нашай рабоце — любоў да дзяцей, збліжэнне з імі ў эмацыянальным плане, — расказвае Святлана. — Перш чым прыступіць да размовы з дзіцем, я імкнуся з ім пасябраваць, даць зразумець, што мне можна давяраць. Заняткі стараюся праводзіць цікава, у форме гульні, выкарыстоўваю новыя методыкі, распрацоўваю свае». Карэспандэнт «Лоеўскага краю» даведаўся, што лагапед выпрабоўвала свае навыкі і дома — на дачцэ. Адна з любімых чыстагаворак — «Ехаў Грэка цераз раку...», якая дапамагае ўпэўнена вымаўляць літару «р».



А бацькам дашкольнікаў, якія не ўсе гукі вымаўляюць чыста, яна дае такую параду: «Самае простае і самае важнае, што могуць рабіць блізкія, — гэта размаўляць са сваімі малымі, абмяркоўваць з імі не толькі меню дзіцячага садка, але і падзеі, з'явы навакольнага свету і ўражанні ад іх. Таксама ім варта выпраўляць граматычныя памылкі, а не замілоўвацца імі, самім паказваць узор для фарміравання правільнай гаворкі дзіцяці».

## Гэта не смецце

Газета «Полымя» Карэліцкага раёна расказвае, што RDF-паліва плануюць вырабляць у Гродзенскім раёне. З усіх цвёрдых камунальных адходаў, якія паступаюць на Гродзенскі смеццесартавальны завод, зараз здабываецца прыкладна 20% другаснай сыравіны. Астатняя частка ідзе на пахаванне. Але яшчэ трэць адходаў можна перарабіць у RDF-паліва (англ. Refuse-derived fuel). Яно складаецца ў асноўным з пластыку і біяраскладальных адходаў. Такое паліва шырока ўжываюць, напрыклад, на цэментных заводах. У тым ліку яго можна выкарыстоўваць для вытворчасці цэменту на ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Адходы спачатку драбняцца, затым сушацца — а ў выніку могуць гарэць. У клінкерных печах завода, дзе тэмпература каля 1000 градусаў, такое паліва згарае практычна цалкам і не вылучае ў атмасферу шкодных рэчываў.

Новая тэхналогія дазволіць павысіць эфектыўнасць сартавання цвёрдых бытавых адходаў да 50%. Як паведаміў генеральны дырэктар абласнога аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алег Шафранскі, перспектыва атрымання RDF-паліва можа мець рэальнае ўвасабленне. Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі часткова выдзелены грошы на набыццё абсталявання, цяпер трэба ствараць праект лініі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# ХТО АДАБРАЎ У КОБРЫНА САМАКІРАВАННЕ?

## Турыстычныя разыначкі аднаго са старажытных райцэнтраў Брэстчыны

**УСЕ мы імкнёмся ўбачыць Луўр альбо Эрмітаж, стараемся пабываць у Траццякоўскай галерэі, а тое, што пабач, вечна пакідаем «на потым». Вось і аўтар гэтых радкоў даўно хацела паглядзець абноўлены домік-музей Суворава ў Кобрыне, ды неяк не выпадала, пакуль кіраўнікі турыстычнай галіны горада не наладзілі прэс-тур.**

### СПАДЧЫНА ПАЛКАВОДЦА

Музей быў закрыты на рэстаўрацыю ў 2014 годзе і адкрыты для наведвальнікаў летась. Экспазіцыя яго, прысвечаная жыццю легендарнага палкаводца Аляксандра Суворава, цікавая мноствам арыгінальных экспанатаў. Музей з'явіўся ў Кобрыне не выпадкова. Менавіта гэты горад з ваколіцай, а дакладней маёнтак «Кобрынскі ключ» падарыла імператрыца Кацярына II военачальніку за асаблівыя заслугі. Адна з такіх заслуг заключалася ў паспяховым падаўленні паўстання Тадэвуша Касцюшкі і яго паплечнікаў. Галоўным чынам за гэта і атрымаў генералісімус зямлю з інфраструктурай і сялянамі на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Вядома, з якой жорсткасцю дзейнічалі сувораўскія вайскоўцы ў тутэйшых мясцінах — не шкадавалі ні старых, ні малых і пралілі нямала крыві не толькі паўстанцаў... Але гэту тэму ў музеі далікатна абыходзяць. Па-мойму, дарэмна. З песні, як кажуць, слова не выкінеш: гэта гісторыя нашага краю, якая мела надта многа трагічных старонак.

> «...Вытворчасць страусавага мяса апошнім часам упала, бо няма попыту. І калі раней даход ад вытворчасці складаў 60—70 працэнтаў, а ад турызму — адпаведна каля 30, то цяпер лічбы памяняліся месцамі.

Але ж фігура Аляксандра Васілевіча Суворава, палкаводца, які за жыццё не прайграў ніводнай бітвы, несумненна, заслугоўвае вывучэння і ўвекавечвання. З пазіцыі стагоддзяў каштоўнымі выглядаюць не толькі баявыя, але і асветніцкія заслугі вайскоўца. Ён пакінуў цэлыя трактаты, кнігі па ваенным мастацтве, у тым ліку невялічкія, якія прызначаліся для вывучэння салдатамі. Часам людзі забываюцца, хто аўтар усім вядомых фразеалагізмаў, такіх як «Цяжка ў вучэнні — лёгка ў баі», «Сам гінь, а таварыша выручай», «Ваяваць не колькасцю, а ўменнем», «Вучэнне — святло, а невучэнне — цемень». А забываць не варта, як і тое, што генералісімус вельмі цаніў простага салдата. Асаблівa актуальна гэта цяпер, калі ўсё грамадства занепакоена праблемай дзедаўшчыны ў войску.

Варта сказаць, што музей вельмі прыстойны — адзін з самых багатых у Беларусі па колькасці экспанатаў. Гэта заслуга стваральніка экспазіцыі, першага дырэктара Аляксея Мартынава. Ён змог наладзіць такія кантакты з калегамі Ленінграда, Масквы, што ў Кобрын пераехалі сотні сапраўдных рарытэтаў XVIII стагоддзя, а таксама



Надмагілле Міцкевічаў.

ранейшых і пазнейшых часоў. Дастаткова сказаць, што тут вам пакажуць капялюш імператара Пятра III, шаблю, падораную імператрыцай Лізаветай, посуд з царскага палаца і шмат іншага. Пашанцавала Кобрыну з Аляксеем Мартынавым. Таму і ёсць тут цяпер музей, які вельмі любяць наведваць расійскія турысты.

### АМАЛЬ ДЭТЭКТЫЎНАЯ ГІСТОРЫЯ

Зазначу, што Суворацкі дом — складовая ваенна-гістарычнага музея, у 16 залах якога расказваецца пра сем вякоў старажытнага горада. Па сутнасці гэта добры краязнаўчы музей з акцэнтам на гісторыю войнаў, якія не абмінулі гэтую зямлю.

Менавіта ў музеі вам раскажуць, што першую перамогу ў вайне 1812 года расійская армія атрымала ў бітве пад Кобрынам. А да стагоддзя згаданай падзеі ў 1910 годзе ў Кобрыне быў пастаўлены помнік, у якога вельмі цікавая гісторыя. Спачатку помнік уяўляў сабой бронзавага двухгаловага арла на гранітным пастаменце. Арол разрываў лаўровы вянок з лацінскай літарай N, што азначала паражэнне Напалеона. Падчас Першай сусветнай вайны немцы адправілі арла на пераплаўку. У 30-я гады палякі на пусты пастамент паставілі бюст Тадэвуша Касцюшкі. У савецкія часы бюст знялі, а ў 50-я гады помнік аднавілі, толькі замест двухгаловага арла вырабілі аднагаловага. Ён і цяпер стаіць на ранейшым месцы. Макет яго ёсць у музеі.

Дарэчы, музей, створаны рашэннем сесіі Брэсцкага абласнога Савета, нядаўна адзначыў сваё 70-годдзе. А заснавальнікам горада князю Уладзіміру Валынскаму і яго жонцы Вользе ўдзячныя нашчадкі праз 700 гадоў паставілі помнік. Паявіўся манумент акурат да дажынак 2009 года. Тыя дажынкі шмат хто ўспамінае добрым словам, бо горад абнавіўся і пахарашэў.

### НАДМАГІЛЛЕ МІЦКЕВІЧАЎ

У Кобрыне многа мясцін і адзнак, якія могуць зацікавіць нераўнадушнага турыста. Вось, скажам, побач са Свята-Петрапаўлаўскай царквой, якую наведваў праваслаўны Сувораў, ёсць надмагілле каталікоў Міцкевічаў. Аказваецца, там пахаваныя родны брат паэта Адама Міцкевіча Аляксандр, яго жонка і сын. Доктар права Аляксандр Міцкевіч доўгі час жыў у Кобрыне, пісаў навуковыя працы, кіраваў маёнткам. Непадалёку, на старых каталіцкіх могілках, захавалася надмагільная пліта Антаніны Касцюшкі, траюрадней пляменніцы Тадэвуша Касцюшкі. Дарэчы, яе першым мужам быў Рамуальд Траўгут. А праз восем гадоў пасля яго смерці Антаніна выйшла замуж за адзінага сына Аляксандра Міцкевіча — Францішка.

У згаданым вышэй прэс-туры ўдзельнічалі прадстаўнікі турфірмаў. Дык вось, адзін з іх агучыў даволі цікавы факт. Аднойчы падчас экскурсіі ў Пінску, якую праводзіла пінскі экскурсавод для палякаў, госці вельмі зацікавіліся месцам пахавання сваякоў знакамітага паэта. Але гід стала іх настойліва адгаворваць, маўляў, там усё закінута, запушчана, і трэба ледзь не праз агароджу лезці, каб убачыць тыя пліты. Хоць на самай справе да надмагілля вядзе дарожка ад царквы, і пахаванне выглядае даволі дагледжаным — за гэтым сочыць ЖКГ. Дык вось, я б на месцы кобрынскіх турфірмаў наладзіла б індывідуальную экскурсію для таго пінскага экскурсавода, каб яна на свае вочы пабачыла памятны знак Міцкевічаў і не ўводзіла ў зман гасцей. Праўда, пліта Антаніны Касцюшкі ўсё ж патрабуе добраўпарадкавання.



Помнік заснавальнікам Кобрына.

### ПІКНІК НА СТРАУСАВЫМ РАНЧА

Страусавая ферма недалёка ад вёскі Тэўлі амаль што стала брэндам Кобрынскага раёна. Самая вялікая ферма гэтай экзатычнай птушкі ў Беларусі паявілася больш за дзесяць гадоў таму. Пабудаваў інфраструктуру на 50 гектарах няўдобіцы і арганізаваў вытворчасць страусавага мяса выпускнік Ціміразеўскай сельгасакадэміі Муса Шораў. Наша газета расказвала пра незвычайны па тым часе праект яшчэ 14 жніўня 2004 года. Праўда, роўна праз год пасля гэтага гаспадар фермы, разлічаны на 1000 галоў птушкі, загінуў у аўтакатастрофе. Справу прадоўжыла яго жонка Тамара Сідарук.

Тамара Сцяпанаўна зрабіла стаўку на турыстычную галіну. Цяпер тут ёсць утульнае кафэ, гасцявыя домікі, сувенірная крама. Гаспадыня фермы сказала карэспандэнту газеты, што вытворчасць мяса апошнім часам упала, бо няма попыту. І калі раней даход ад вытворчасці складаў 60—70 працэнтаў, а ад турызму — адпаведна каля 30, то цяпер лічбы памяняліся месцамі. Турызм таксама вельмі важны кірунак дзейнасці. Нядаўна, напрыклад, адкрылі заапарк, цяпер, акрамя страусаў, наведвальнікам паказваюць іншых жывёлін. Але Тамара Сідарук спадзяецца, што ўсялякія крызісы часовыя, і ў будучым яны зноў змогуць нарасціць вытворчасць. Тады ў яе будуць працаваць не дзесяць нанятых работнікаў, як зараз, а ўтрая больш. А вось прыём наведвальнікаў яны маюць намер развіваць і далей, бо турысты сюды едуць. Сорамна толькі за два кіламетры дарогі, якія мясцовая ўлада даўно абяцае зрабіць.

### АГРАСЯДЗІБЫ З ТРАДЫЦЫЯМІ

На Кобрыншчыне гасцей прымаюць 22 аграсядзібы. Адна з іх — «Палеская традыцыі» — знаходзіцца ў вёсцы Андронава, што зусім побач з раённым цэнтрам. Яе гаспадыня Ніна Главацкая збірае скарбы народнай культуры даўно. Ніна Мікітаўна аб'ехала ўсе навакольныя вёскі, сабрала мноства бабуліных строяў, якія літаральна валяліся на гарышчах, перарабіла гэтыя касцюмы пад сябе і сустракае ў іх гасцей. А яшчэ яна абсталявала сялянскую хату першай паловы мінулага стагоддзя. Для наведвальнікаў тут ладзяцца цікавыя экскурсіі з песнямі, частушкамі, нават анекдотамі з сельскага жыцця.

Гаспадыня расказвала пра сваіх гасцей з розных краін, пра тое, якія святы і абрады праводзяць з сям'ёй і аднавяскоўцамі. Ніна Главацкая наогул вельмі цікава расказвае, акцэнтуе ўвагу на жыццёвай філасофіі нашых продкаў. Яны вельмі многа працавалі для хлеба надзённага, не мелі нічога з цяперашніх выгод цывілізацыі, але ўмелі быць шчаслівымі. Паводле яе слоў, гэта парадокс для сучаснага чалавека і нагода для абдумвання.

Ну, а каб лепей думалася, на сядзібе частуюць вельмі смачнымі стравамі беларускай кухні, а хто жадае і хто не за рулём, таму гаспадыня прапануе ўласнага прыгатавання наліўку.

* * *

Паводле інфармацыі **арганізатара прэс-тура, кіраўніка раённай фізкультурна-аздараўленчай установы «Атлант» Віктара БРЫШТЭНА**, летась ваенна-гістарычны музей наведала прыкладна 12 тысяч турыстаў. Супрацоўнік музея Аляксандр Чырун правёў цікавую экскурсію па горадзе. Паказаў, дзе размяшчаюся старажытны замак і іншыя гістарычныя мясціны, і расказаў, чаму кабрынчане не надта любяць караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Усё проста: каралева Ганна Ягелонка некалі магдэбургскае права гораду даравала, а кароль Станіслаў адабраў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2017 года.**